

**Гуляць з грашыма — згодна з правіламі**

СТАР. 2



**Мадэлі для профільных класаў**

СТАР. 3



**Дзе шукаць новыя звесткі пра Скарыну?**

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. СУБОТА № 106 (27964) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

## «КАНСТЫТУЦЫЯ» Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

### Менавіта так, не перабольшваючы, называюць новы для краіны дакумент

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры абмеркавалі канцэпцыю праекта Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Ён унікальны па сваёй сутнасці не толькі для постсавецкіх краін, але для ўсяго свету. Плануецца, што ў першым чытанні дэпутаты ніжняй палаты беларускага парламента разгледзяць яго ўжо падчас асенняй сесіі.**

«Цяпер мы пачынаем непасрэдную працу над праектам кодэкса», — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, навуцы і культуры Аляксандр Сягоднік. Ён падкрэсліў, што дакумент гэты запатрабаваны і ахоплівае ўсе напрамкі культурнай дзейнасці.

У сваю чаргу міністр культуры Барыс Святлоў сказаў, што дакумент закліканы «сістэматызаваць нарматыўную прававую базу ў сферы культуры». На яго думку, кодэкс — гэта апошні этап у фарміраванні заканадаўства ў гэтым напрамку, яе лагічны і натуральны фінал. «Бо закон — гэта жывы арганізм, у якім усё павінна своечасова саспець», — дадаў ён.

Складальнікі «культурнай канстытуцыі» ўлічылі мінулыя памылкі, якія былі дапушчаны пры стварэнні Кодэкса аб адукацыі. Прытым гэтым разам за аснову была ўзята практычная сфера дзейнасці. Усе нарматыўныя акты разглядаліся менавіта праз гэту прызму. Пры гэтым праўкі ва ўжо існуючыя законы ўносіць не збіраюцца. Адзінае выключэнне — відавочныя супярэчнасці ў дакументах.

Пакуль канкрэтныя карэкціроўкі не прапаноўваліся, а абмяркоўвалася канцэпцыя кодэкса. Хоць некаторыя яго асаблівасці можна адзначыць ужо і сёння. Напрыклад, для Беларусі цяпер актуальная праблема чорных капальнікаў («Звязда» неаднойчы пра гэта пісала). Яны сваімі дзеяннямі руйнуюць культурны пласт і не даюць папаўняцца музейным фондам археалагічнымі артэфактамі. А гэта перашкаджае высвятляць сапраўдныя факты развіцця беларускай гісторыі. Таму ў адным з раздзелаў прапісана, што прафесійна і выпадкова выяўленыя археалагічныя артэфакты падлягаюць перадачы ў дзяржуласнасць. Таму іх грамадзянскае абарачэнне на тэрыторыі краіны забаронена і дазволена толькі для дзяржарганізацый, якія займаюцца навукова-даследчыцкай і музейнай дзейнасцю.

Падчас пасяджэння дэпутат Генадзь Пальчык, член Пастаяннай камісіі, прапанаваў падрыхтаваць мадэльны закон у Міжпарламенцкую асамблею дзяржаў СНД на 2016-2020 гг. На яго думку, Кодэкс аб культуры змог бы стаць адным з яго варыянтаў. Тым больш што сярод краін былога СССР яму не існуе аналагаў. На што міністр культуры адрэагаваў станоўча, аднак дадаў, што спачатку кодэкс павінен даказаць сваю эфектыўнасць у Беларусі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**



## «Эх, досвітак маленства, лета! Вамі навек душа сагрэта!»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КОСІНЕЦ, Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Беларусь мае намер усяляк падтрымліваць рэалізацыю ініцыятыў Старшыні КНР Сі Цзіньпіна аб стварэнні эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Наша краіна з'яўляецца надзейным партнёрам Кітая ў ажыццяўленні гэтага стратэгічна важнага праекта. Паміж Беларуссю і Кітаем склаліся адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, якія па выніках візіту выйшлі на новы, яшчэ больш высокі ўзровень. Візіт кітайскага лідара ў Мінск прадэманстраваў значэнне супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем. Пра тое, што абедзве краіны маюць намер у далейшым паглыбляць эканамічнае ўзаемадзеянне, сведчыць і стварэнне Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку, які наведалі Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін; важным быў таксама ўдзел лідараў дзвюх дзяржаў у беларуска-кітайскім міжрэгіянальным бізнес-форуме».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15316,00 | ▲ |
| Еўра | 17294,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 273,56 | ▼ |
| Укр. грыўня | 732,47 | ▲ |

■ Медыяпрастора

## ЧЫМ СЛОВА НАША АДГУКНЕЦЦА...

### Міністр інфармацыі — аб адказнасці, сумленнасці і прафесіяналізме

**На пачатку наступнага тыдня распачне сваю работу X Беларускі міжнародны медыяфорум. Яго тэма сёлета — «Партнёрства дзеля будучыні: спадчына Вялікай Перамогі». На мерапрыемства збяруцца прадстаўнікі СМІ з далёкага і блізкага замежжа. Іх чакае цікавая напружаная праца, бо гаварыць гэтым разам будуць пра надзвычай важныя на сённяшні дзень паняцці. Аб тэме форуму, аб сучасных працэсах у СМІ, аб прафесійнай і чалавечай адказнасці журналістаў «Звязда» напярэдадні форуму спыталася ў міністра інфармацыі Беларусі Ліліі АНАНІЧ.**

***— Лілія Станіславаўна, Беларускі міжнародны медыяфорум праводзіцца ў нашай краіне ўжо дзясяты раз. Але, здаецца, менавіта гэтым летам на абмеркаванне журналісцкай супольнасці вынесена самая вострая і актуальная тэма, якая нікога не пакідае абыякавым. Бо, гаворачы аб 70-годдзі Вялікай Перамогі, мы будзем гаварыць і пра гістарычную праўду, і пра крохкі мір, які менавіта гэтая праўда заклікана дапамагчы захаваць, і, несумненна, пра ролю ў гэтым СМІ.***

— Так, гэты форум сапраўды ў нейкай ступені можна назваць вызначальным. Тэма гістарычнай праўды стаіць сёлета надзвычай востра, у журналісцкай суполцы — асабліва. Пра гэта, дарэчы, вялася размова на прафесійным узроўні і падчас выставы «СМІ ў Беларусі», якая сёлета праходзіла якраз напярэдадні святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі і таксама была прымеркаваная да гэтай даты. Так што форум можна назваць працягам дыялогу аб ролі СМІ і кожнага журналіста асобна ў тым, якое грамадства, які свет ёсць сёння і якімі яны будуць заўтра. Мяркую, дыялог гэты на форуме будзе цікавы, з рознымі пунктамі гледжання, з дыскусіямі. А яго мэта — выпрацаваць агульныя падыходы, знайсці трывалую глебу для кансалідацыі медыясупольнасці. А іх, я ўпэўнена, мы здолеем знайсці, бо ёсць жа агульныя рэчы, аднолькава важныя для ўсіх, незалежна ад таго, у якой краіне ты жывеш і якія маеш палітычныя перакананні.

СТАР. 2



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Кампетэнтна — пра зручнае

## «ДОМА ВЫБРАЎ І ЗАКАЗАЎ, А ПРЫВЕЗЛІ — ЗАПЛАЦІЎ»

### Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» развівае продаж айчынных тавараў праз інтэрнэт-краму

**«Паслухай, у вас у горадзе магазінаў шмат. Купі мне...» Гэту фразу чуў, мусіць, кожны з гараджан. І ці не кожны купляў. Добра яшчэ, калі касу, валёнкі, альбо прыправы для каўбас. А калі нешта з адзення ці ў падарунак унучцы?.. І адмовіць як быццам няёмка, і згадзіцца — сябе пакараць: паспрабуй дагадзі некаму, калі сабе не заўсёды можаш...**

**Цяпер і вяскоўцы, і гараджане могуць уздыхнуць з палёгкай. Яно ж за шчасце, маючы грошы, нікога ні аб чым не прасіць: самому хадзіць у крамы, самому бачыць, што выпускаюць цяпер нашы «Гарызонт» ці «Алеся», «Палессе» ці шклозавод «Нёман», самому нешта купляць і тым самым удасканальваць, упрыгожваць сваё ж жыццё.**

**Сучасныя тэхналогіі дазваляюць гэта рабіць, у тым ліку і жыхарам самай глыбокай глыбінкі!.. І, што важна, нікуды не выязджаючы, не выходзячы з дому, часам — не ўстаючы з канапы.**

**Фантастыка? Ужо рэальнасць. РУП «Белпошта» развівае продаж тавараў нашых, айчынных вытворцаў праз новую інтэрнэт-краму. Пра тое, як яна працуе, мы папрасілі расказаць намесніка генеральнага дырэктара прадпрыемства па камерцыйных пытаннях Таццяну ГВОЗДЗЕВУ.**

***— Таццяна Мікалаеўна, пошта аказвае безліч паслуг — як сваіх, традыцыйных, кшталту дастаўкі пісьмаў, перыядычных выданняў, пенсій і дапамог, так і партнёрскіх... Быў сярод іх гандаль па каталогах беларускіх вытворцаў. У апошні час з'явілася інтэрнэт-крама. Гэта, як трэба разумець, крок наперад?***

— Безумоўна. Гандаль мы сталі развіваць з 2010 года. Спачатку ў каталогах было каля 30 вытворцаў. Але ж у любой справе галоўнае пачаць, паказаць, што гэта такое і як яно працуе. У аддзяленні сувязі альбо ў паштальёна наш кліент браў каталог, гартаў, нешта для сябе выбіраў і афармляў заказ. Мы, паводле заяўкі, бралі тавар у вытворцы і дастаўлялі заказчыку.

СТАР. 4

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АПЕК захавала квоты на здабычу нафты

Арганізацыя краін-экспарцёраў нафты (АПЕК) прыняла рашэнне захаваць квоту на здабычу нафты на ранейшым узроўні — 30 мільёнаў барэляў за суткі. Пра гэта абвясціў міністр нафты і мінеральных рэсурсаў Саудаўскай Аравіі Алі аль-Наімі. Ён таксама адзначыў, што наступная сустрэча нафтавага картэля адбудзецца 4 снежня. Міністр дадаў, што ён задаволены рашэннем. Нафтавыя каціроўкі ў апошнія дні ваганіся на фоне чакання рашэння АПЕК. Пасля прыняцця рашэння барэль Brent стаў каштаваць 62,52 долара. У пачатку тыдня, 1 чэрвеня, за яго давалі 64,88 даляра. Нафтавы кошык АПЕК каштуе 59,67 долара за барэль. Раней, 5 чэрвеня, міністр нафты Ірана Біжан Намдар Зангане сказаў, што большасць удзельнікаў АПЕК лічаць цану на паліва ў 75 даляраў за барэль справядлівай і аптымальнай для рынку.

### Мусульмане папрасілі арганізаваць у Маскве гендарна раздзельныя пляжы

Мэрыю Масквы папрасілі арганізаваць у горадзе асобныя пляжныя зоны адпачынку для вернікаў-мужчын і жанчын. Аўтарам ініцыятывы стаў член камісіі па гарманізацыі міжнацыянальных і міжрэлігійных адносін Грамадскай палаты РФ, першы намеснік старшыні Цэнтральнага духоўнага кіравання мусульман Альбір Крганаў. На яго думку, падчас летняга адпачынку тысячы вернікаў-масквічоў сутыкаюцца з абмежаваннямі па рэлігійных матывах. У прыватнасці, многія не могуць прыходзіць на агульны пляж, паколькі лічаць агаленне ў прысутнасці асоб супрацьлеглага полу непрымальным. Крганаў нагадаў, што практыка ўладкавання асобных пляжаў існуе ў іншых краінах (напрыклад, у Германіі, Турцыі, Ізраілі). Аналагічныя пляжы арганізаваны ў Казані.



КОРАТКА

Мінскі кінатэатр «Перамога» закрыюць з 8 ліпеня да 1 кастрычніка.

**XIV абласное свята-конкурс майстроў драўлянай манументальнай скульптуры «Сонечнае цяпло дрэва» пройдзе з 10 па 19 чэрвеня ў курортным пасёлку Нарач Мядзельскага раёна.**

Пасольства Латвіі ў Мінску будзе прымаць дзяцей-чарнобыльцаў, якія выязджаюць на аздараўленне, у спецыяльныя дні. «Калі раней візы для гэтай катэгорыі грамадзян выдаваліся ў Мінску і Віцебску, то цяпер будуць толькі ў Мінску», — сказалі ў консульстве.

**Больш як 3,2 т незаконна вылаўленай рыбы канфіскавана ў браканьераў вясной 2015 года.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ПРАЗ ГАЗЕТУ МОЖНА ВЫРАШЫЦЬ МНОГІЯ ЖЫЦЦЁВЫЯ ПЫТАННІ»

**Пётр НАВУМЕНКАЎ, пенсіянер**, *г. Мінск:*

— Калі я вучыўся ў школе, вельмі любіў беларускую літаратуру: і прозу, і паэзію. Ведаў на памяць паэму Янкі Купалы «Курган», а таксама «Тарас на Парнасе», асобныя фрагменты з «Дзясятага падмурка» Паўлюка Труса і іншыя. Таму і сёння з задавальненнем чытаю ў «Звяздзе» апавяданні розных аўтараў. Я хоць і фізік па адукацыі, але склад розуму ў мяне філалагічны (*смяецца*).

Увогуле «Звязду» я чытаю столькі, колькі сябе памятаю. А пастаянна выпісваць стаў газету пасля заканчэння ўніверсітэта — недзе ў 1960 годзе. За гэты час у нашай сям'і спрабавалі выпісваць і іншыя выданні (не замест «Звязды», а разам з ёй), але ў выніку па розных прычынах адмаўляліся ад іх, не здраджваючы толькі адзінай штодзённай беларускамоўнай газеце.

«Звязда», без перабольшвання, наша сямейная газета, мы чытаем яе ўсе. І я прыхільнік таго, каб як мага больш людзей ведала родную мову. Балюча перажываю, калі недзе па радыё ці па тэлебачанні не зусім правільна вымаўляюць тое ці іншае слова па-беларуску. А наша газета — падручнік, па якім гэтаму можна вучыцца.

Са «Звязды» можна даведацца самыя свежыя навіны ў краіне і ў замежжы. Вельмі грунтоўна на старонках газеты абмяркоўваюцца пытанні дзяржаўнай палітыкі, эканомікі. Шматпланава прадстаўлена ваенная тэматыка і пытанні медыцыны, шмат матэрыялаў пра навуку і культуру. Мне зразумелыя і падабаюцца такія артыкулы. Дастаткова добра прадстаўлена спартыўная тэма. Скажам, рэпартажы і фотаздымкі спартсменаў падчас правядзення зімовых Алімпійскіх гульняў у Сочы нібы пераносілі на месца падзей.

У «Звяздзе» заўсёды можна выбраць артыкул, які табе будзе цікавы. Праз газету можна вырашаць і многія жыццёвыя пытанні. Напрыклад, пры правядзенні першай прыватызацыі ў мяне ўзніклі сумненні ў правамоцнасці атрыманых дакументаў. Я звярнуўся ў «Звязду» — і літаральна праз некалькі дзён на яе старонках быў апублікаваны грунтоўны адказ спецыялістаў, які ўнёс поўную яснасць у маё пытанне. Той экзэмпляр газеты захоўваю дагэтуль — як дакумент.

Аб'ём выдання за апошні час істотна павялічыўся. Разам з тым я завочна ведаю амаль усіх журналістаў «Звязды» і да ўсіх стаўлюся з аднолькавай павагай. Вельмі спадзяюся, што з кожным годам газета будзе прыцягваць усё новых чытачоў!

**Запісаў Сяргей РАСОЛЬКА.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

5 разоў на тыдзень!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

■ Маладым — дарога

# СЁННЯ ЮНАКІ — ЗАЎТРА КІРАЎНІКІ

**У Мінску распачаўся рэспубліканскі маладзёжны форум «Лідар». На мерапрыемства прыехала больш за сто прадстаўнікоў студэнцкай, працоўнай моладзі і той, якая яшчэ вучыцца.**

Першымі ўдзельнікаў віталі сенатары, а дакладней — **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**. «У нас у краіне выдатная моладзь, і не толькі я так лічу. Моладзь энергічная, адукаваная, законапаслухмяная, і зусім не маюць рацыі тыя, хто сцвярджае адваротнае. Моладзь, вядома, амбіцыйная па сваёй сутнасці, і, хутчэй за ўсё, мы, як людзі старэйшага пакалення, недастаткова працуем, каб заўважаць у гэтым асяроддзі найлепшых і давяраць ім адказныя ўчасткі работы, у тым ліку ў органах дзяржаўнага кіравання, дэпутацкім корпусе», — сказаў спікер верхняй палаты. На яго думку, трэба актыўней працаваць у гэтым кірунку, выяўляць лідараў і весці планамерную працу, як гэта і робіць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Ён таксама прапанаваў БРСМ уносіць прапановы наконт найбольш перспектыўных і таленавітых маладых людзей. Гэта, паводле слоў старшыні Савета Рэспублікі, можна будзе рабіць «праз Адміністрацыю Прэзідэнта, аблвыканкамы і Мінгарвыканкам», а таксама Міхаіл Мясніковіч паабяцаў, што ў працэс уключыцца і Савет Рэспублікі. Калі такая сістэма будзе ўведзена ў практыку, праца аб'яднання над фарміраваннем будучых кадраў набудзе сапраўдную карысць.

Форум «Лідар» — адно са звёнаў лідарскай праграмы Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Яе асноўная задача — мэтавая падрыхтоўка тых, хто валодае здольнасцямі і патэнцыялам да кіраўніцкай дзейнасці. «Нашы актывісты, збіраючыся разам, па сутнасці, натхняюцца, бо бачаць, што па ўсёй краіне ёсць такія ж маладыя людзі, як яны — ініцыятыўныя, актыўныя, са сваім пунктам гледжання. І хто ведае, можа, праз гады менавіта гэтыя хлопцы стануць сенатарамі, дэпутатамі, кіраўнікамі», — дзеліцца сваім бачаннем **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.**

Дарэчы, лідары завіталі не з пустымі рукамі, а з ідэямі і праектамі. Так, Марыя Гаўрылік, пяцікурсніца Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы кіруе дзейнасцю БРСМ на сваім факультэце, а ў найбліжэйшай будучыні стане настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. «Настаўнік таксама павінен весці за сабой, быць актыўным, — кажа яна. — Я лічу, што сёння важна прывіваць дзецям культуру чытання. Таму трэба заахвочваць праводзіць як выхаваўчыя, так і навуковыя мерапрыемствы». А Марк Шамсутдзінаў, вучань 10-га класа 5-й гімназіі Гродна, які ў будучыні збіраецца вучыцца на псіхатэрапеўта, ужо арганізоўвае ў гімназіі мерапрыемствы па псіхалагічным развіцці. І за такімі маладымі, ініцыятыўнымі сапраўды будучыня.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Гульня па правілах

# АФШОРЫ БОЛЬШ НЕ ПАТРЭБНЫ

## Указ аб дзейнасці рынку Форэкс зробіць беларускі сегмент гэтай сферы больш прывабным і для нашых грамадзян, і для замежнікаў

**Апошнім часам у нашай краіне з'явілася шмат новых відаў фінансавых інструментаў. Для некаторых з іх пакуль адсутнічае спецыяльнае заканадаўства. Гэта абмяжоўвае магчымасці эфектыўнага функцыянавання айчыннага фінансавага рынку, а таксама зніжае яго ёмістасць. Выправіць сітуацыю, якая склалася, павінен падпісаны 4 чэрвеня Указ Прэзідэнта №231 «Аб ажыццяўленні дзейнасці на пазабіржавым рынку «Форэкс». У дакумента ёсць усе шанцы на паспяховы эфект, лічыць дырэктар афіцыйнага парнёра «Альпары» ў Мінску Аляксандр Сабодзін.**

### СРОДКІ БУДУЦЬ АБАРОНЕНЫ

Паводле неафіцыйных звестак, на рынку «Форэкс» удзельнічаюць больш за 20 тысяч грамадзян Беларусі, а сума інвеставаных імі грашовых сродкаў перавышае 40 млн долараў у эквіваленце. Неабходнасць заканадаўчага рэгулявання гэтай сферы відавочная.

«Указ распрацоўваўся некалькі гадоў, — гаворыць эксперт. — І, зразумела, мы пазітыўна ўспрымаем сам факт яго падпісання, бо лічым, што без цывілізаванага рынку немагчымае развіццё галіны. Раней усё адбывалася стыхійна, ніхто не рэгуляваў гэту сферу. Адпаведна ўзнікала шмат праблем — на рынку прысутнічалі не толькі добрасумленныя кампаніі, але і фірмы-аднадзёнкі, махляры. А пачаткоўцу вельмі цяжка вызначыць, дзе добрая, надзейная кампанія, а дзе падман. Не надта складана стварыць прыгожы сайт, разрэкламаваць сябе. На жаль, мы назіралі зусім нядаўна шэраг гісторый з падобнымі структурамі. А цяпер кампаніі павінны будуць адпавядаць пэўным патрабаванням: ад аб'ёму статутнага капіталу да якасцяў і кампетэнцыі дырэктара. Кліентам будзе выгадна заключаць дагаворы з беларускімі кампаніямі, а не з афшорамі. Акрамя гэтага, запланавана стварэнне Нацыянальнага форэкс-цэнтра, які будзе займацца справаздачнасцю і абаронай укладзеных сродкаў насельніцтва».

Нацыянальны форэкс-цэнтр — гэта гаспадарчае таварыства, у статутным фондзе якога больш за 50% акцый (долей) будзе знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці і які будзе забяспечваць зніжэнне сістэмных рызык на пазабіржавым рынку «Форэкс». Нацыянальны цэнтр сфарміруе ў парадку, вызначаным указам, гарантыйны фонд за кошт узносаў форэкс-кампаній, банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый для безумоўнага выканання ўдзельнікамі рынку абавязацельстваў па вяртанні кліентам маржынальнага забеспячэння пры немагчымасці выканання форэкс-кампаніямі такіх абавязацельстваў за кошт уласных сродкаў і забяспечвальнага капіталу, а банкамі, нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі — за кошт уласных сродкаў.

### УКРАІНЦЫ І РАСІЯНЕ ЗАЦІКАВЯЦЦА

«Адзінае маё пажаданне — каб у далейшым указ працаваў. Паколькі ён рамачны, а дэталі будуць удакладняцца дакументамі Нацыянальнага банка, то я спадзяюся на тое, што ўсе гэтыя нарматыўныя акты будуць дапамагаць развіццю рынку, — тлумачыць Аляксандр Сабодзін. — Акрамя гэтага, мы чакаем, што прыняцце ўказа паспрыяе павышэнню цікавасці да рынку «Форэкс» не толькі з боку грамадзян Беларусі, але і замежнікаў. Асабліва гэта тычыцца Украіны і Расіі. У апошняй адпаведны закон таксама прыняты, але тут спрацуюць больш выгадныя ўмовы ў беларускай юрысдыкцыі — як для форэкс-кампаній, так і для кліентаў. А ва Украіне гэта сфера яшчэ не рэгулюецца».

І сапраўды: беларускія грамадзяне, якія не мелі магчымасці здзяйсняць аперацыі на пазабіржавым рынку «Форэкс» праз айчынныя кампаніі, вымушаны былі гэта рабіць праз замежныя, што ў сваю чаргу было звязана з істотнымі прававымі і эканамічнымі рызыкамі для іх. Пры такой мадэлі ўзаемадзеяння грошы беларусаў фактычна працавалі на эканоміку іншых замежных дзяржаў, дзе дзейнасць на рынку «Форэкс» была заканадаўча ўрэгуляваная. Падаткі, адпаведна, выплачваліся замежнымі кампаніямі ў бюджэты тых краін, дзе яны ажыццяўлялі дзейнасць.

### ЦІ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ ПАДАТКІ?

Згодна з указам, быць кліентамі форэкс-кампаній могуць любыя фізічныя і юрыдычныя асобы, а ўжо непасрэдна ажыццяўляць аперацыі маюць права толькі банкі, нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі, форэкс-кампаніі і Нацыянальны форэкс-цэнтр.

Як правіла, даходы грамадзян ад здзяйснення аперацый на фінансавым рынку краіны не абкладаюцца падаходным падаткам. Такі ж падыход закладзены і ва ўказе — у адпаведнасці з ім да 1 сакавіка 2019 года вызваляюцца ад падаходнага падатку даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі па заключаных з форэкс-кампаніямі, банкамі, нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі пагадненнях.

Указ уступіць у сілу праз 9 месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

# ЧЫМ СЛОВА НАША АДГУКНЕЦЦА...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

І мір сярод гэтых агульных каштоўнасцей выходзіць сёння на першае месца. Ролю СМІ ў наш інфармацыйны час у яго захаванні нельга пераацаніць. Мы ўжо былі сведкамі, як газетныя і віртуальныя публікацыі, тэлевізійныя сюжэты фактычна разбуралі грамадства і распачыналі ўзброеныя канфлікты. Сёння журналісцкай супольнасці вельмі важна згуртавацца дзеля міру. Наладзіць у медыяпрасторы партнёрства дзеля будучыні — тэма форуму, як бачыце, адлюстроўвае і яго галоўную мэту.

***— Увогуле, думка пра тое, што пераможцам можна лічыць таго, хто выйграе вайну інфармацыйную, сёння набывае новую значнасць і новае сапраўды літаральнае гучанне. Нічым не даказаны «кампрамат», пастановачныя сюжэты, якія выдаюцца за ўзятыя з жыцця, сталі звычайнай справай. Як прыклад — сітуацыя ў суседняй Украіне. На вашу думку, з прычыны чаго так адбываецца? Журналістыка насамрэч становіцца першай прадажнай прафесіяй?***

— Наконт «прадажнасці» тэзіс не новы, ён з'явіўся, пэўна, разам з самой прафесіяй. Тут размову трэба весці і аб адказнасці, і, безумоўна, аб прафесіяналізме. Бо прафесіянал, калі ён даражыць сваім іменем, ніколі не паддасца спакусе зрабіць нешта, што супярэчыць яго сумленню і перакананням, нават за вялікія грошы. Я глыбока перакананая: усе сапраўдныя журналісты, незалежна ад таго, дзе яны працуюць, павінны ўсведамляць сваю адказнасць, адчуваць сваю еднасць з краінай, у якой жывуць. А гэта значыць, працаваць на згуртаванне грамадства, на стварэнне і развіццё, мір і кансалідацыю.

А яшчэ падаецца, што так званыя інфармацыйныя войны — гэта добры экзамен для грамадства на яго сталасць. Людзі, якія думаюць пра сваю будучыню і пра будучыню сваёй краіны, не будуць хапацца за «смажаныя» факты з газеты ці тэлевізара (а ўсё часцей — з сеціва) і ісці лямантаваць на плошчу, шукаючы вінаватых і патрабуючы пакарання. Адукаваны, самадастатковы, проста разумны чалавек усё ўзважыць, прааналізуе і, урэшце, абавязкова зразумее, дзе праўда, а дзе — бурбалкі на вадзе. Памятаеце, як сказаў аднойчы наш Прэзідэнт, калі падчас рабочай паездкі людзі запыталіся ў яго пра падзеі ва Украіне? Калі ўсё пачутае і ўбачанае ў СМІ з таго і другога боку падзяліць на дзесяць, тады і атрымаецца праўда.

***— Тым не менш, і гэта неаднойчы падкрэслівалі замежныя госці выставы «СМІ ў Беларусі», у нашых СМІ атрымліваецца прытрымлівацца «залатой сярэдзіны», найбольш блізкай да таго, што завецца аб'ектыўнасцю...***

— А гэта і ёсць сведчанне таго, што грамадства ў нас сталае. Людзі не купляюцца на танныя сенсацыі ці зрэжысаваныя канфлікты. А няма ў грамадстве попыту на падобную інфармацыю, яна пачынае губляцца, нягледзячы на немалыя сродкі, якія ў яе прасоўванне «прадзюсарамі» ўкладваюцца.

***— Панэльныя дыскусіі, якія будуць праводзіцца падчас медыяфоруму, фактычна ўсе так ці інакш закрануць тэму перамен у сучасным свеце і ролі СМІ ў асвятленні гэтых працэсаў. Яшчэ адно ключавое слова тут — адказнасць. Як лічыць міністр інфармацыі, што ляжыць у гэтай плоскасці найперш: сумленне і адказнасць перад сваім чытачом (гледачом) або рэгуляванне, кантроль, строгія прававыя нормы і прыцягненне да адказнасці за іх невыкананне?***

— Галоўная цэнзура, што існуе для журналіста, — гэта яго сумленне і, калі хочаце, творчае самалюбства. Чалавек, які паважае сваё імя і аўдыторыю, для якой ён працуе, ніколі не дазволіць сабе паклёпнічаць, правакаваць канфлікты, заклікаць да гвалту. Гэта ляжыць у плоскасці сумлення і, паўтару яшчэ раз, прафесіяналізму.

Але ёсць яшчэ і плоскасць закону. Ён у дэмакратычным грамадстве аднолькавы для ўсіх, і парушаць яго не можа ніхто. І калі журналіст ці СМІ існуючае заканадаўства парушае, у сілу ўступае права. Звычайная практыка ўсяго цывілізаванага свету: за кожнае напісанае і сказанае слова трэба адказваць.

***— Падчас Летняй школы журналістыкі, якая традыцыйна праводзіцца ў рамках форуму, перад будучымі супрацоўнікамі СМІ выступаюць іх старэйшыя калегі, праводзяць майстар-класы. Пра што на сённяшні дзень трэба гаварыць з маладымі журналістамі перш за ўсё?***

— Сёлета па традыцыі на Летнюю школу журналістыкі збяруцца маладыя людзі з усёй краіны: студэнты, маладыя супрацоўнікі рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ. З імі павядуць размову мэтры журналістыкі з Беларусі, Расіі, Арменіі. Упэўнена, што гэта будуць цікавыя і карысныя для нашай журналісцкай моладзі ўрокі прафесійнага майстэрства.

У Год моладзі ўсім юнакам і дзяўчатам — асаблівая ўвага, а творчым маладым людзям дадзена проста неабмежаваная магчымасць праявіць свае здольнасці, агучыць і ажыццявіць свае ідэі. Бадай, менавіта гэта і ёсць галоўны кантэкст: што свабода — гэта не ўсёдазволенасць, што слова ў СМІ, калі ім неахайна ці неабдумана скарыстаешся, можа стаць небяспечнай зброяй, што, калі ты прыйшоў у журналістыку, ты павінен увесь час вучыцца, творча развівацца і адказваць за сваю працу... Элементарныя, звычайныя нават рэчы, але пра іх варта нагадваць зноў і зноў. Не толькі маладым людзям, але і іх старэйшым калегам.

***— Па выніках медыяфоруму заўсёды прымаецца рэзалюцыя. Што, на ваш погляд, патрэбна, каб яна стала настаўленнем да канкрэтных дзеянняў, а не ператварылася проста ў дэкларацыю?***

— Кожнаму з нас працаваць на сваім месцы так, каб не было сорамна ні перад сваімі чытачамі і гледачамі, ні перад самімі сабой.

**Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

■ Не быць абыякавым

# ЖЫЦЦЁ ТАКОЕ ЎРАЗЛІВАЕ...

**Ужо па традыцыі днямі ў Мінску адбыўся адзін з найбуйнейшых дабрачынных канцэртаў «Дотык да жыцця». Яго ідэйным натхняльнікам і галоўным арганізатарам з'яўляецца дабрачынны аднайменны фонд. Сёлета канцэрт-марафон прайшоў пад дэвізам «Зоркі» Беларусі — дзецям!» з удзелам вядомых артыстаў: UZARI&Maimuna, Іскуі Абалян, Аляксея Хлястова, Тэа, Настассі Ціхановіч, Аляксандра Ціхановіча і Ядвігі Паплаўскай, гурта J:MORS і многіх іншых.**

Асноўнай мэтай правядзення гэтага дабрачыннага мерапрыемства з'яўляецца аказанне матэрыяльнай дапамогі дзецям з анкалагічнымі захворваннямі, інвалідам, што засталіся без апекі бацькоў, а таксама актыўнае прыцягненне грамадзян нашай краіны да справы дабрачыннага і валанцёрскага руху. Канцэрт накіраваны на тое, каб звярнуць увагу грамадства на праблему хворых дзяцей і паспрыяць прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва ў Беларусі.

Дабрачынны канцэрт «Дотык да жыцця» праходзіць кожны год пры падтрымцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб» і ГА «Беларускі саюз жанчын».

Ларыса Івашкевіч, старшыня мясцовага дабрачыннага фонду «Дотык да жыцця», адзначыла:

— Чалавечае жыццё вельмі ўразлівае: ты можаш пабудаваць вельмі добрую лодку, але навальніца яе патопіць. Ты можаш клапаціцца аб пасевах, а іх пагубіць хвароба і шкоднікі. І толькі добрыя справы, толькі любоў і спагада, якія мы аддаём іншым, застаюцца з намі назаўсёды. Кантактаванне з дзецьмі, асабліва з тымі, у каго ёсць праблемы са здароўем, дае нам магчымасць вярнуцца да чысціні, шчырасці, да непасрэднасці, успомніць сябе самога. Мы верым у тое, што пачаты намі дабрачынны марафон «Дотык да жыцця» аб'ядпае неабыякавых людзей, якія імкнуцца дапамагчы дзецям у іх нялёгкім змаганні за жыццё!

Варта пра гэта не забываць і імкнуцца дапамагаць хаця б тым, хто побач з вамі.

■ Сацыёлагі сведчаць

# БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ГЛЯДЗІЦЬ У БУДУЧЫНЮ З АПТЫМІЗМАМ

**Да такой высновы прыйшлі сацыёлагі па выніках маштабнага даследавання «Беларусь 2030», якое завяршылася ў канцы мінулага года. Пра гэта расказаў Ігар КАТЛЯРОЎ, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук, паведамляе БЕЛТА. Ён паведаміў, што рэспандэнтам задавалася пытанне, з якой асноўнай праблемай можа сутыкнуцца краіна праз 10-15 гадоў. «Аказалася, што, на думку рэспандэнтаў, самая вялікая праблема, якая будзе чакаць нашу краіну ў будучыні, — дэмаграфічная», — сказаў ён.**

Як адзначыў Ігар Катляроў, існуе думка, што сацыялогія займаецца толькі прыкладны́мі даследаваннямі, аднак гэта не зусім дакладна. «Інстытут сацыялогіі займаецца таксама тэарэтычнымі аспектамі. Магу звярнуць увагу толькі на некалькі момантаў. Напрыклад, доўгі час у краіне гавораць пра неабходнасць пераходу ад мажарытарнай выбарчай сістэмы да прапарцыянальнай. Мы ўважліва вывучылі гэтае пытанне і прыйшлі да высновы, што гэта не зусім мэтазгодна для Беларусі, прычым і з пункту гледжання вучоных, і з пункту гледжання нашых рэспандэнтаў», — сказаў ён, спасылаючыся на вынікі сацыялагічных апытанняў, праведзеных у сярэдзіне 2014 года.

Пры гэтым дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН растлумачыў: у гэтым выпадку асноўнымі элементамі з'яўляюцца палітычныя партыі, якіх у Беларусі 15, аднак іх рэйтынгі вельмі невысокія. «Сёння толькі 4,5% насельніцтва краіны лічаць, што неабходна пераходзіць менавіта да прапарцыянальнай сістэмы — праводзіць выбары па партыйных спісах», — заўважыў ён.

Па выніках апытанняў, па словах Ігара Катлярова, было падрыхтавана некалькі аналітычных запісак, і ў выніку нават тыя апазіцыйныя структуры, якія прасоўвалі ідэю пераходу ад мажарытарнай выбарчай сістэмы да прапарцыянальнай, пагадзіліся з сацыёлагамі.

Гаворачы пра найбольш актуальныя пытанні, якія хвалююць сучаснае грамадства, Ігар Катляроў закрануў тэму аднаполых шлюбаў. Дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН нагадаў, што не так даўно Ірландыя на ўсеагульным рэферэндуме значнай большасцю прагаласавала за легалізацыю аднаполых шлюбаў. «У Беларусі толькі 2,2% насельніцтва падтрымліваюць аднаполыя шлюбы, значыць, сёння ў нас галоўнае — традыцыйная, нармальная сям'я, якая дасць магчымасць развівацца», — заўважыў сацыёлаг.

# ПРА ПАМЯЦЬ І БЯСПАМЯЦТВА

**Сёлетні X Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: спадчына Вялікай Перамогі» пройдзе ў кантэксце знакавага юбілею. Вельмі важна акцэнтаваць грамадскую ўвагу на пытаннях захавання гістарычнай памяці, — падкрэслівае член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны рэдактар газеты «Гомельская праўда», старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў Сяргей БЯСПАЛЫ.**



— Да 9 мая мы выдалі кнігу «Ніколі не забудзем». У ёй ёсць многа дакументаў, якія дагэтуль уражваюць. Напрыклад пісьмо дзяўчынкі, якая жыла ў нямецкім палоне. Яна прасіла бацьку адпомсціць за яе і маці... Колькі б часу ні прайшло, падзеі 70-гадовай даўніны забываць нельга. Сёння ж некаторыя дагаварыліся да таго, што ў Вялікай Айчыннай вайне перамог не савецкі народ, а нехта іншы. Гэта робіцца наўмысна, каб прынізіць ролю Савецкага Саюза і сказіць гістарычныя факты. Менавіта таму мы будзем працягваць расказваць пра вайну — каб нам не змаглі навязаць іншую ідэалогію. У нас яшчэ ёсць унікальная магчымасць мець стасункі з людзьмі, якія не па кніжках ведаюць пра вайну. Галоўнае — паспець з імі пагутарыць. Я ўпэўнены, што ў такім выпадку гісторыя застанецца не скажонай. Людзі сыходзяць, але ж памяць застаецца.

***— Сяргей Міхайлавіч, вам не здаецца, што само паняцце «патрыятызм» сёння адыходзіць на другі план? Як і іншыя духоўныя каштоўнасці, якія падмяняюцца матэрыяльнымі...***

— Заўсёды на нейкіх складаных этапах развіцця грамадства з'яўляюцца людзі, гатовыя што заўгодна прадаць. У вайну таксама былі не толькі героі, але здраднікі і паліцаі. Але ж гэта далёка нераспаўсюджаная з'ява. І не ўсе страцілі пачуццё патрыятызму. Так, у мяне прынцыповая пазіцыя: на работу ў рэдакцыю мы бяром супрацоўнікаў, для якіх патрыятызм, прафесіяналізм і чалавечая прыстойнасць — не пустыя гукі. Патрыятызм павінен зараджацца яшчэ ў сям'і: з адпаведных адносін да старэйшых, да сваёй гісторыі, да сваёй Айчыны. Менавіта гэтыя каштоўнасці потым суправаджаюць чалавека на працягу ўсяго жыцця. Патрыятызм пачынаецца з сямейных стасункаў, а потым перарастае ў любоў да радзімы. Гэта стрыжань чалавека — яго духоўнасць, унутраны свет, ідэалы. Урэшце, чалавек павінен несці адказнасць як за сваю сям'ю, так і за сваю краіну.

***— А якая роля СМІ ў гэтых працэсах?***

— Мы проста абавязаны на іх уплываць. І зноў жа, пачуццё патрыятызму можна развіваць на ўласным прыкладзе, прыкладзе калектыву. У нашай рэдакцыі многія мае калегі працуюць даўно, любяць сваю справу. Калі да нас прыходзяць маладыя журналісты, заўсёды ёсць тыя, хто перадасць ім свой вопыт і стаўленне да працы.

**Гутарыла Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ДЛЯ СЭКАНД-РЭЧАЎ — ДАДАТКОВАЯ АПРАЦОЎКА

**У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 мая 2015 года №393 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь» унесены змяненні ў Правілы продажу асобных відаў тавараў і ажыццяўлення грамадскага харчавання.**

Так, з 1 ліпеня адзенне і абутак, якія былі ў карыстанні, перад продажам падлягаюць у абавязковым парадку мыццю ці хімічнай чыстцы (у залежнасці ад віду вырабаў) у аб'ектах, што аказваюць такія паслугі. Хімічная чыстка, мыццё і прасаванне, рамонт і рэстаўрацыя іншых тавараў, якія былі ў карыстанні, гардзіна-цюлевыя вырабы, сталовая бялізна, напольныя пакрыцці, дывановыя вырабы, галаўныя ўборы, гандлёвыя і турыстычныя палаткі, тэнты, шатры і інш. — праводзяцца па неабходнасці.

У Міністэрстве гандлю нагадалі, што, у адпаведнасці з Правіламі продажу асобных відаў тавараў і ажыццяўлення грамадскага харчавання, рэчы, якія былі ў карыстанні, могуць прадавацца ў спецыялізаваных крамах, павільёнах ці спецыялізаваных секцыях крамаў па гандлі нехарчовымі таварамі. Да такіх рэчаў адносяцца як камісійныя тавары, так і адзенне і абутак сэканд-хэнд.

Увядзенне дадатковай апрацоўкі рэчаў, якія былі ў карыстанні, шляхам мыцця ці хімічнай чысткі будзе садзейнічаць абароне правоў спажыўцоў пры рэалізацыі ім дадзенага віду тавараў — дазволіць прыбраць непрыемныя пахі, выдаліць забруджванне, што не атрымалася зрабіць у працэсе санітарна-гігіенічнай і проціэпідэмічнай апрацоўкі, палепшыць увогуле таварны від вырабаў. Прадпрыемствы, якія аказваюць паслугі хімічнай чысткі і паслугі пральняў, зараз маюць сучаснае абсталяванне і матэрыялы, што дазваляюць на высокім узроўні праводзіць дадатковую апрацоўку рэчаў, якія былі ў карыстанні.

### ВЕЛАСІПЕДЫ — «ХІТ» КРАДЗЯЖОЎ ЛЕТАМ

**Мінулагодні чэрвень у сталіцы стаў самы «ўраджайным» месяцам для веласіпедных зладзеяў. У сярэднім у горадзе штодня скрадвалі каля шасці двухколавых транспартных сродкаў. Першыя дні сёлетняга чэрвеня паказалі, што негатыўная тэндэнцыя захоўваецца. 1-га чысла было зафіксавана сем такіх крадзяжоў, 2-га — тры.**

Колькасць крадзяжоў веласіпедаў у сталіцы расце, відаць, у такой жа прагрэсіі, як і колькасць велаўладальнікаў, што адзначаюць у прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. Прычым пікам здзяйснення гэтага віду злачынстваў становяцца менавіта летнія месяцы. Летась у чэрвені, згодна са статыстыкай, быў пастаўлены «рэкорд» такіх крадзяжоў — 170 веласіпедаў.

Як адзначаюць праваахоўнікі, з улікам росту папулярнасці ў мінчан гэтага віду транспарту нават стала заўважнай... перакваліфікацыя на такі «промысел» некаторых аўтамабільных зладзеяў. І прычына таму, як кажуць, на паверхні — веласіпед стаў даступным прадметам для замаху. У 80 працэнтах выпадкаў скрадзеныя двухколавыя машыны былі пакінуты без нагляду ў пад'ездах ці тамбурах шматкватэрных жылых дамоў. У гэтай сувязі нельга не сказаць пра бясклапотнасць саміх уладальнікаў веласіпедаў.

Праваахоўнікі нагадваюць, што свой транспартны сродак нельга пакідаць без нагляду нават на кароткі час. Паркуючы яго, трэба карыстацца запорнымі ўстройствамі, імкнуцца, каб веласіпед заставаўся пад увагай. Нядрэнна, каб непадалёку была камера відэаназірання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У ГРОДНЕ З'ЯВІЛАСЯ САЦЫЯЛЬНАЕ ТАКСІ

**Першай пасажыркай аўтамабіля, аснашчанага пад'ёмным прыстасаваннем для перавозкі інвалідаў-калясачнікаў, стала Кацярына Зорка — яна накіравалася ў цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна.**

Права скарыстацца сацыяльным таксі на бясплатнай аснове маюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, інваліды-калясачнікі і шэраг іншых катэгорый людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Гэтая паслуга прапануецца для паездак у межах горада ва ўстановы аховы здароўя і адукацыі, аздараўленчыя і рэабілітацыйныя комплексы, у органы ўлады, жыллёва-камунальныя службы, на вакзалы і іншыя сацыяльныя аб'екты. Гарвыканкам будзе кампенсаваць аўтобуснаму парку адпаведныя расходы.

Каб заказаць сацыяльнае таксі, трэба не пазней чым за двое сутак да ажыццяўлення паездкі звярнуцца з заяўкай у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва: жыхарам Ленінскага раёна г. Гродна — па тэл. 741-232, жыхарам Кастрычніцкага раёна г. Гродна — па тэл. 681-671.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ТЭРМІНАЛЫ АТРЫМАЮЦЬ АДТЭРМІНОЎКУ?

**Міністэрства гандлю звярнулася ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь з ініцыятывай падаўжэння тэрміну абавязковай устаноўкі плацежных тэрміналаў у Мінску і гарадах абласнога падпарадкавання да 1 студзеня 2016 года.**

У сувязі з тым, што ўказам Прэзідэнта ад 30 сакавіка 2015 года №143 да 1 студзеня наступнага года падоўжаны тэрмін рэалізацыі рэштак тавараў, увезеных індывідуальнымі прадпрымальнікамі — плацельшчыкамі адзінага падатку — на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў — членаў Мытнага саюза без суправаджальных дакументаў да 1 ліпеня, Міністэрства гандлю лічыць магчымым падтрымаць суб'екты малога бізнесу ў частцы падаўжэння тэрміну абавязковай устаноўкі плацежных тэрміналаў. Гэтую ініцыятыву падтрымаў Нацыянальны банк.

### КАНТРАФАКТНЫ СМАК «КАМУНАРКІ»

**Супрацоўнікі службы БЭЗ сталіцы пры садзейнічанні Інтэрпола МУС Беларусі разам з украінскімі калегамі спынілі дзейнасць падпольнага цэха па вытворчасці кантрафактнай прадукцыі гандлёвай маркі «Камунарка».**

Аператыўная інфармацыя, што на тэрыторыі Украіны дзейнічае падпольная арганізацыя, якая незаконна выпускае прадукцыю пад брэндавай маркай вядомага беларускага прадпрыемства, паступіла праваахоўнікам яшчэ летась. Пра гэта паведаміла старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Вераніка Пасмеццева. Падчас правядзення сумесных з украінскім бокам праверачных мерапрыемстваў на тэрыторыі Чарнігаўскай вобласці быў выяўлены завод з двух цэхаў па вытворчасці кантрафактнай прадукцыі. Падчас вобыскаў у вытворчых і складскіх памяшканнях праваахоўнікі канфіскавалі прадукцыю, сыравіну і абсталяванне на агульную суму больш за 2 мільёны грыўняў (амаль 1,5 мільярда беларускіх рублёў). Апроч таго, у офісных памяшканнях былі канфіскаваны «шэрыя» бухгалтарскія дакументы, падробленыя пячаткі і штампы, этыкеткі са знакамі для тавараў і паслуг «Камунарка».

### ПАЛІВА Ў ПЛАСТЫКАВЫХ БУТЭЛЬКАХ

**У тайніках мікрааўтобуса грамадзянін спрабаваў незаконна вывесці 73 літры дызельнага паліва. Але ў пункце пропуску «Махро» на беларуска-ўкраінскім участку граніцы яго спынілі супрацоўнікі Брэсцкай мытні.**

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, кіроўца транспартнага сродку 39-гадовы грамадзянін Украіны пры выездзе з нашай краіны прыхаваў у канструктыўных нішах пад сядзеннямі і ў запасным коле пад днішчам мікрааўтобуса 73 пластыкавыя бутэлькі з палівам. Лёс затрыманага мікрааўтобуса («Мерседэс-Бенц» 2009 года выпуску коштам звыш 250 мільёнаў рублёў) і схаванага ад мытнага кантролю паліва вызначыць суд.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Раслад на заўтра

# ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ТРАЕКТОРЫЯ ДЛЯ КОЖНАГА ВУЧНЯ,

## або Асаблівасці фарміравання профільных класаў

**Масавы пераход старшых класаў школы на профільнае навучанне — перспектыва найбліжэйшых гадоў.**

На думку намесніка міністра адукацыі Раісы СІДАРЭНКІ, задача абавязкова вярнуць профільныя класы ў тыя ўстановы адукацыі, дзе яны функцыянавалі раней, не стаіць. Як не стаіць і задача адкрыць профільныя класы ў кожнай школе ці гімназіі. Галоўны прынцып, які будзе рэалізоўвацца, — гэта паступовае і плаўнае ўкараненне профільнага навучання на старшай ступені школы. Пры ўвядзенні профільнага навучання ў адукацыйным стандарце закладзены два ўзроўні — базавы і павышаны. Гэта значыць, што разам з профільнымі класамі ў школах застануцца на старшай ступені і звычайныя, дзе ўсе прадметы будуць вывучацца на базавым узроўні. Днямі Міністэрства адукацыі больш падрабязна растлумачыла асаблівасці фарміравання профільных класаў і падгруп у новым навучальным годзе.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рашэнне аб адкрыцці профільных класаў у канкрэтнай установе адукацыі будзе прымаць яго кіраўнік, узгадняючы яго з заснавальнікам. Профільны клас можа быць адкрыты толькі пры выкананні комплексу ўмоў. Сярод гэтых патрабаванняў — наяўнасць ва ўстанове адукацыі неабходных кадравых, матэрыяльна-тэхнічных і вучэбна-метадычных рэсурсаў. У прыватнасці неабходна мець добра абсталяваныя сучасныя кабінеты фізікі, хіміі, біялогіі і г.д., якія дазволяць у поўным аб'ёме рэалізаваць практычную частку навучальных праграм павышанага ўзроўню. Да пачатку 2015/2016 навучальнага года ўсе педагагічныя работнікі, якія будуць працаваць у профільных класах, павінны павысіць сваю кваліфікацыю.

Залічэнне вучняў у 10-я профільныя класы будзе праводзіцца на конкурснай аснове па выніках адзнак у пасведчанні аб агульнай базавай адукацыі. Пры гэтым **адзнакі па профільных прадметах павінны быць не ніжэйшыя за 7 балаў, а сярэдні бал пасведчання — не ніжэйшы за 6 балаў.** Пайсці вучыцца ў 10-ты профільны клас можна ў любую ўстанову адукацыі пры наяўнасці там свабодных месцаў. Тыя вучні, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ў гімназіях, пры жаданні змогуць працягнуць адукацыю і ў 10-м гімназічным класе без здачы ўступных выпрабаванняў.

Пераможцы трэцяга і заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды па профільных вучэбных прадметах будуць залічвацца без уліку сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі і адзнак па профільных прадметах. Што тычыцца ліцэяў, то ў гэтых агульнаадукацыйных установах прыём у 10-я класы будзе праводзіцца таксама па конкурсе, але на аснове ўступных выпрабаванняў.

Міністэрства адукацыі прапануе тры мадэлі прафілізацыі навучання ў старшай школе.

**Мадэль 1:** аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць на павышаным узроўні аднолькавыя вучэбныя прадметы.

**Мадэль 2:** аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць на павышаным узроўні розныя вучэбныя прадметы.

**Мадэль 3:** аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць асобныя вучэбныя прадметы на павышаным узроўні і навучэнцаў, якія ўсе вучэбныя прадметы вывучаюць на базавым узроўні.

Фактычна размова ідзе пра мультыпрофільнае навучанне, пры якім вучні вывучаюць па іх выбары розныя прадметы ў асобных групах: з аднымі аднагодкамі, напрыклад, на павышаным узроўні яны могуць вывучаць матэматыку і англійскую мову ці матэматыку і хімію, з другімі — на базавым узроўні фізіку, а з трэцімі — на базавым узроўні гісторыю, біялогію і г.д. Пры гэтым кожны вучань мае індывідуальны расклад заняткаў. Адна з галоўных пераваг мультыпрофільнага навучання заключаецца ў тым, што яно можа ўкараняцца як у буйных установах адукацыі, так і ў невялікіх, дзе няма некалькіх класаў у паралелі.

**Колькі ўрокаў у тыдзень будзе ў профільных класах?**

Матэматыка — 6 урокаў (на базавым — 4 урокі).
Фізіка, хімія, біялогія — 4 урокі (на базавым — 2 урокі).
Замежная мова — 5 урокаў (на базавым — 3 урокі).
Беларуская, руская мова — 3 урокі (на базавым узроўні — 1 урок).
Геаграфія — 3 урокі (на базавым — 2 урокі).

Колькасць напрамкаў, па якіх жадаюць навучацца старшакласнікі, фарміруецца з улікам магчымасцей установы адукацыі: гэта могуць быць як некалькі канкрэтных напрамкаў, напрыклад, фізіка-матэматычны і хіміка-біялагічны ці хіміка-біялагічны і гуманітарны, так і дастаткова вялікі набор спалучэнняў вучэбных прадметаў для вывучэння іх на павышаным узроўні. Кожны, хто вырашыў паступаць у ВНУ, выбірае для павышанага ўзроўню тыя дысцыпліны, якія спатрэбяцца яму для паступлення на выбраную спецыяльнасць.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі могуць адкрывацца таксама класы прафесійнай накіраванасці для арыентацыі старшакласнікаў на атрыманне педагагічных, ваенных і іншых спецыяльнасцей. Педагагічныя класы фарміруюцца па тых жа правілах, што і звычайны профільны клас. Школьнікі будуць вывучаць у педагагічных класах на павышаным узроўні тыя прадметы, якія яны самі плануюць у будучыні выкладаць. Акрамя таго, вучні педагагічных класаў абавязкова засвойваюць праграму факультатыўнага занятку «Уводзіны ў педагагічную прафесію. X-XI клас».

Сёння разглядаецца магчымасць асаблівага парадку прыёму ў ВНУ на педагагічныя спецыяльнасці для тых дзяцей, хто скончыў педагагічныя класы. Мяркуецца, што па рэкамендацыі педсавета такія дзеці змогуць паступаць у ВНУ на педспецыяльнасці без экзамену — такое ж права было дадзена летась школьным медалістам.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

**Даведка «Звязды»**

У сталіцы ў 2014/2015 навучальным годзе вывучэнне асобных прадметаў вялося на павышаным узроўні ў 195 з 368 дзясятых класаў школ, гімназій і ліцэяў. У гімназіях дзейнічалі 136 профільных класаў і 59 класаў — у школах. 75 класаў мелі фізіка-матэматычны напрамак (1596 навучэнцаў), 83 — філалагічны (1956 навучэнцаў), 15 — хіміка-біялагічны (364 навучэнцы), 3 — грамадазнаўчы і 2 — эканамічны. Таксама ў Мінску дзейнічалі 17 мультыпрофільных класаў і класаў з дзвюма мадэлямі.

Размеркаванне навучэнцаў дзясятых класаў па напрамках навучання: каля 44% з іх выбралі філалагічны напрамак, амаль 42% — фізіка-матэматычны, 10,8% — хіміка-біялагічны і 1,7% — грамадазнаўчы і гісторыка-праваазнаўчы.

■ Надвор'е

## КАМФОРТНА І БЕЗ АПАДКАЎ

**Камфортнае надвор'е без ападкаў чакаецца ў Беларусі на выхадных, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**

У суботу будзе без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 3-10 градусаў вышэй за нуль, днём плюс 20-26, па паўднёвым захадзе да 28 градусаў.

«Гарачай будзе нядзеля, 7 чэрвеня, калі з паўднёва-заходнімі вятрамі да нас пачне паступаць цёплае паветра з Балканскага паўвострава, ночы стануць цяплейшыя — тэмпература паветра складзе 8-15 градусаў вышэй за нуль. Днём паветра прагрэецца да плюс 24-31 градуса», — падкрэсліла Святлана Рыбакова.



У пачатку наступнага тыдня пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, і на большай частцы тэрыторыі Беларусі зноў стане крыху халадней. Тэмпература паветра ўначы складзе 7-14 градусаў вышэй за нуль, днём — 16-23 градусы цяпла. І толькі па паўднёвым усходзе будзе па-летняму цёпла — уначы плюс 15-17, днём максімальная тэмпература складзе 24-30 градусаў цяпла.

Галоўны сіноптык Гідрамета таксама паведаміла, што тэмпература вады ў рэках і вадаёмах Беларусі складае 19-23 градусы вышэй за нуль.

■ Напярэдадні

**Аляксандр ХАЦКЕВІЧ:**

## «ЗБОРНАЯ — ГЭТА ГУЛЬНЯ НА ВЫНІК, А НЕ МЕСЦА ДЛЯ НАВУЧАННЯ ГУЛЬНІ Ў ФУТБОЛ»

**Зборная краіны працягвае падрыхтоўку да кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы 2016 года. Заўтра нашы футбалісты згуляюць таварыскі матч з камандай Расіі. Гульня пройдзе ў Маскве на арэне «Хімкі». Затым, ужо ў Барысаве, 14 чэрвеня, каманда Аляксандра Хацкевіча пазмагаецца ў кваліфікацыі са зборнай Іспаніі.**



Напярэдадні ад'езду ў Маскву галоўны трэнер нацыянальнай зборнай расказаў пра бліжэйшыя паядынкі.

***— Якія задачы перад футбалістамі ставіць трэнерскі штаб на гульню з Расіяй?***

— Некаторыя хлопцы ўжо скончылі клубны сезон: нехта 29 мая, нехта на дзень ці два пазней. У гэтым тыднёвым цыкле галоўнае для нас — захаваць тонус гульцоў. Згуляем з Расіяй, затым будзем рыхтавацца да Іспаніі. Трэба сказаць, нашай камандзе вельмі карысна будзе сустрэцца з такім сур'ёзным сапернікам, як каманда Расіі. У іх адна з ключавых гульняў — матч з Аўстрыяй. Так што я не думаю, што расіяне пойдуць на эксперыменты ў сустрэчы з беларусамі. З намі яны будуць гуляць баявым складам. З нашага боку напярэдадні гульні з Іспаніяй таксама ніякіх эксперыментаў не будзе. Не варта казаць пра нейкую прынцыповасць паядынку з Расіяй. Гэта ўсяго таварыскі матч для падрыхтоўкі да адборачнай гульні супраць іспанцаў.

***— Вы, напэўна, глядзелі матчы зборнай Расіі. На ваш погляд, у чым іх праблемы?***

— За зборную Расіі я не магу гаварыць. У іх добры, збалансаваны склад. А чаму няма жаданага выніку? Гэта іх унутраныя справы. У нас шмат інфармацыі па камандзе Расіі. Пакажам і раскажам хлопцам, якія плюсы і мінусы ў саперніка.

***— Якая думка склалася ў вас пра узровень гульцоў чэмпіянату Беларусі? Ці ёсць прорва паміж імі і легіянерамі?***

— Шчыра скажу, чэмпіянат Беларусі нізкага ўзроўню — па якасці футбола, па якасці выканання. Гэта праблема. Фінал Кубка разглядаць не будзем, але якасць футбола ў большасці гульняў чэмпіянату нават не сярэдняя — нізкая.

***— Чаму сярод гульцоў, выкліканых у зборную Беларусі, няма нашага бразільца Брэсана і Дзяніса Лапцева з Мозыра?***

— Мы разглядалі Брэсана для прыцягнення да збору каманды, але Рэнан папрасіў, каб яго не выклікалі па сямейных абставінах. Усе мы людзі і павінны па-чалавечы падыходзіць да жыццёвых сітуацый. З нагоды Лапцева мне задаюць шмат пытанняў, ён шмат забівае ў апошніх матчах, але гэта ўсяго толькі чэмпіянат Беларусі. Разумееце ўзровень турніру, так? Хай хлопец добра згуляе ў наступным туры чэмпіянату, і не выключана, што пасля таварыскага матча з Расіяй Лапцеў будзе выкліканы ў зборную.

***— На збор вы запрасілі адразу чатырох варатароў. Хто з іх паляціць на матч з Расіяй?***

— У Маскву паляцяць Чэрнік і Гутар, плануем, што яны згуляюць па тайме. Гарбуноў яшчэ задзейнічаны ў чэмпіянаце Грэцыі, прыляціць у каманду 9 чэрвеня. Да афіцыйнага матча з Іспаніяй будуць рыхтавацца Жаўноў, Гарбуноў і адзін з галкіпераў беларускага чэмпіянату. Той, хто лепш праявіць сябе ў гульні з расіянамі.

***— Другі раз запар не выкліканы Віталь Радзівонаў. Раскажыце чаму?***

— Мы прынялі такое рашэнне. Кожны футбаліст выклікаецца не проста так. Па Радзівонаву скажу так: мы лічым, што сёння ёсць футбалісты больш моцныя.

***— Як вы лічыце, працэс амаладжэння для зборнай Беларусі цяпер актуальны?***

— Штучна ніхто маладых гульцоў браць у зборную не стане. Ніякага амаладжэння дзеля амаладжэння не будзе. Гулец павінен зарэкамендаваць сябе ў клубе, і там паказваць класную гульню. Мне пашпарт не важны, павінна быць гульня. Ужо гатовая, змястоўная, спелая. А хто яе будзе паказваць — 16-гадовы хлопец або 35-гадовы ветэран — усё роўна. Зборная — гэта гульня на вынік, гэта не месца для навучання гульні ў футбол.

***— Вы былі на гульнях у Пінску, Мінску, іншых гарадах. Як вам футбольная атмасфера на стадыёнах?***

— У Пінску было холадна ***(смяецца)***. Добрая была атмасфера ў Гомелі: стадыён чыста футбольны. Гэта прымушае футбалістаў па-іншаму зірнуць на гульню, бо гуляем для гледачоў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Вучымся гуляючы

# «ЗЯЛЁНАЕ» СВЯТА Ў ЛОШЫЦКІМ ПАРКУ

## Як школьнікі адзначылі Сусветны дзень аховы наваколля

**Для эколагаў 5 чэрвеня даўно стала прафесійным святам. Але калі дарослыя ў гэты дзень падводзяць вынікі сваёй дзейнасці, то чым займаюцца дзеці? Напэўна, праз гульні знаёмяцца з прыродазнаўчымі навукамі і пазнаюць свет, у чым давялося пераканацца падчас гарадскога дзіцячага экалагічнага свята «Зямлі маёй аблічча жывое». Мерапрыемства было арганізавана Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольля і Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама.**


На «Зялёным канцэрце» не абышлося без страуса.


Жывёльная тэматыка ў трэндзе.



Мікалай ТУРКО разам з унукамі Уладзем і Міланай праглядаюць дадатак «Роднай прыроды» — часопіс у часопісе для дзяцей і падлеткаў «Юны натураліст».


Сяброўкі Яна ГЕРЫНА *(справа)* і Карына МАЛІНОЎСКАЯ малююць птушку года — вушастую саву.


З асновамі электрычнасці дзяцей знаёміў супрацоўнік Цэнтра экалагічных рашэнняў Павел ГАРБУНОЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Галоўным «спаборніцтвам» стаў конкурс-квэст «Зялёны лабірынт», у якім удзельнічалі 10 камандаў з усяго Мінска. Ці кожны дарослы зможа адрозніць спеў вялікай сініцы ад голасу берасцянкі? А як доўга «жыве» пластык, выкінуты на палігон альбо пакінуты ў лесе?

На свяце кожнаму знайшоўся занятак па інтарэсах. Аматары кіно «пасяліліся» каля ўтульнага намёта грамадскай кампаніі «Багна». Стужка «Чалавек лесу» распавядала маленькім гледачам пра індыйскага эколага, які на працягу дзесяцігоддзяў высаджваў дрэвы на беразе ракі, ад чаго бясплодная зямля ператварылася ў лес. А «Подых балот» — гэта беларускі фільм, які адлюстраваў жыццё людзей на балотах і нялёгкі лёс асушаных тарфянікаў.

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» зрабіла стаўку на «Птушку года». Супрацоўнік «АПБ» Карына Салавей выбірала найлепшы партрэт вушастай савы: асфальт стаў пярэстым ад драпежніц, намаляваных каляровай крэйдай. Не абышлося і без карысных гаджэтаў. Над гульнёй для планшэтаў «Экакідс» ад грамадскага аб'яднання «Экапартнёрства» дзеці «завісалі» надоўга: яны мусілі на хуткасць адсартаваць адходы па кантэйнерах, адключыць лішняе святло ў пакоі і наліць чыстай вады ў акварыум. У фургончыку-музеі Цэнтра экалагічных рашэнняў можна было даведацца ўсё пра энергазберажэнне дома і ў школе. «Мінскае веласіпеднае таварыства» забяспечыла катанне на веласіпедах — маршруты былі простыя, але пакручастыя.

Выдавецкі дом «Звязда» таксама далучыўся да свята. Рэдакцыя часопіса «Родная прырода» прадставіла прыродазнаўчы дадатак для школьнікаў «Юны натураліст».

**Кацярына РАДЗЮК**

## АЛЕСЬ КАМОЦКІ ЗБІРАЕ СЯБРОЎ

**Гэта ўжо і традыцыя, і добрая нагода сустрэцца ў адным з самых прыемных мінскіх месцаў — у Купалаўскім музеі. Менавіта тут 9 чэрвеня, у дзень свайго нараджэння, Алесь Камоцкі ладзіць свята для адданых прыхільнікаў беларускай паэзіі і песні.**

Як жартуе сам выканаўца, яго выступленне перад сябрамі адбудзецца пры любым надвор'і. Але вопыт мінулых гадоў падказвае, што сонца ў гэты дзень традыцыйна ўсміхаецца, краскі квітнеюць, як гэта і належыць быць на пачатку лета.

У выступленні спадара Камоцкага 9 чэрвеня возьмуць удзел два выдатныя гітарысты — Алег Змушка (з якім, па словах Алеся, ён працуе на сцэне ўжо паўжыцця) і Юры Сілавец. Канцэртная праграма складаецца з песень розных гадоў. Прыемна тое, што выканаўца даволі часта саступае настойлівым просьбам і выконвае заказы ўдзячнай публікі на біс.

Уваход на гэтую імпрэзу вольны. Але сябры раяць прыходзіць на выступленне Алеся раней вызначанага часу (19 гадзін). Бо вопыт ранейшых канцэртаў паказвае: вольных месцаў у зале, калі выступае сапраўдны артыст і паэт, не бывае.

**Ларыса РАКОЎСКАЯ.**

## «УРЭЗАЛІ» ЧАС ПРОДАЖУ АЛКАГОЛЮ

**У Мінску з 15 чэрвеня продаж алкагольных, слабаалкагольных напояў і піва будзе весціся толькі з 9 да 22 гадзін, пра што паведамілі ва ўпраўленні гандлю і паслуг Мінгарвыканкама.**

Такія рашэнні прыняты адміністрацыямі раёнаў з улікам інфармацыі ад ГУУС Мінгарвыканкама, што найбольш негатыўнае ўздзеянне на крымінагенную абстаноўку ў горадзе аказвае рэалізацыя напояў з утрыманнем этылавага спірту ў гандлёвай сетцы сталіцы ў начны час сутак. Гэтае абмежаванне не закране прадпрыемствы сферы грамадскага харчавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## На арэлях лета — з любімай газетай!

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на III квартал або II паўгоддзе 2015 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 14 ЛІПЕНЯ 2015 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**




Сярод падпісчыкаў 16.07.2015 г. будзе разыграна 7 падвесных крэслаў-гамакоў і суперпрыз — садовыя арэлі. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26.07.2015 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.09.2015 г. пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2015 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» чытайце ў №101 газеты «Звязда» за 30.05.2015 г.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 01.06.2015 ПА 30.09.2015.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2568 ад 25.05.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь

**ПРЫЕМНАЯ НАВІНА — цэны на падпіску на газету «Звязда» на другое паўгоддзе засталіся ранейшымі! Заставайцеся з намі — будзе цікава!**

**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2015 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ на III кв. або 2-е паўг. 2015 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [______] (індэкс) ____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

# ПРЫЯРЫТЭТЫ — ЗА ГАНДЛЕМ І ІНВЕСТЫЦЫЙНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВАМ

**Госць «Звязды» — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Сербіі Уладзімір ЧУШАЎ. Гутарка з ім супала з маючым адбыцца візітам у Беларусь Старшыні Народнай Скупшчыны Сербіі Маі Гойкавіч.**

***— У найбліжэйшы час запланаваны візіт кіраўніка парламента Сербіі ў Беларусь. Што, на ваш погляд, сербскі бок чакае ад гэтага візіту?***

— Візіт Маі Гойкавіч, Старшыні Народнай Скупшчыны Сербіі, як называецца сербскі парламент, з'явіцца лагічным працягам двухбаковага дыялогу на вышэйшым і высокім узроўнях. У 2013—2014 гадах адбыліся афіцыйныя візіты кіраўнікоў дзяржаў і міністраў замежных спраў нашых краін.

Надышоў час і для сустрэч старшыняў парламентаў, што будзе азначаць павышэнне ўзроўню ўжо існуючага міжпарламенцкага дыялогу.

Хачу адзначыць, што гэта першы ў гісторыі беларуска-сербскіх адносін візіт на ўзроўні спікера парламента.

Думаю, што сербскі бок, як і беларускі, чакае ад гэтага візіту важнага імпульсу для актывізацыі і далейшага развіцця кантактаў і ўзаемадзеяння дэпутатаў Беларусі і Сербіі для павышэння эфектыўнасці супрацоўніцтва вышэйшых заканадаўчых органаў. Абмен досведам заканатворчасці будзе садзейнічаць павышэнню якасці законаў, якія прымаюцца, а вопыт міжнародных сувязяў у розных інтэграцыйных утварэннях паслужыць лепшаму паразуменню паміж народнымі выбраннікамі нашых дружалюбных краін.

***— Беларусь апошнім часам зрабіла мноства дастаткова эфектыўных крокаў па пашырэнні кантактаў з Еўропай. Якое месца Сербіі ў гэтых працэсах?***

— Сербія з'яўляецца кандыдатам у члены Еўрасаюза, і яе натуральным жаданнем з'яўляецца хутчэйшае ўступленне ў гэтае міждзяржаўнае ўтварэнне. Становішча Сербіі як кандыдата дастаткова ўразлівае. Яна залежыць не толькі ад пазіцыі Еўракамісіі і іншых інстытутаў ЕС, але і ад меркавання асобных дзяржаў — членаў Еўрасаюза.

Бялград прыняў на сябе шэраг абавязацельстваў, у тым ліку ўзгадняць сваю знешнюю палітыку з ЕС. Аднак Сербія хоць і вымушана далучылася да аднабаковых абмежавальных мер Еўрасаюза ў дачыненні да Беларусі, але на практыцы робіць выключэнні з гэтых абмежаванняў. Прэзідэнт Сербіі Таміслаў Нікаліч шчыра стараецца падтрымліваць і пашыраць кантакты з нашай краінай, у сакавіку 2013 года ён нанёс афіцыйны візіт у Беларусь і прыняў з візітам у адказ кіраўніка беларускай дзяржавы ў Бялградзе ў чэрвені мінулага года.

У кантактах з прадстаўнікамі Еўрасаюза нашы сербскія сябры выступаюць за развіццё ўзаемавыгадных адносін з Беларуссю. Гэтую лінію Сербія праводзіць і на пляцоўцы АБСЕ, дзе старшынюе сёлета. Па парламенцкай лініі Сербія з'яўляецца назіральнікам у АДКБ. Спадзяюся, што візіт спадарыні Маі Гойкавіч паслужыць прыкладам і сігналам да развіцця супрацоўніцтва з Беларуссю іншым еўрапейскім парламентам і дэпутатам.

***— У Беларусі і Сербіі багатыя гістарычныя, культурныя стасункі. Мы пра гэта ўжо размаўлялі ў адным з вашых інтэрв'ю «Звяздзе»... Што сёння складае прыярытэт у адносінах з Сербіяй?***

— Безумоўна, прыярытэт складаюць гандаль, вытворчая каапярацыя, інвестыцыйнае супрацоўніцтва. За апошнія 5 гадоў беларускі экспарт у Сербію вырас у 4,5 раза, таксама павялічыўся і тавараздварот, што сведчыць аб збалансаванасці і двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, якое носіць, такім чынам, узаемавыгадны характар.

У беларускім экспарце Сербія перамясцілася з 45-га на 25-е месца па выніках мінулага года, што пераканаўча сведчыць аб праведзенай бакамі працы.

Тут задзейнічаны такія інструменты, як міжурадавая беларуска-сербская камісія па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, 8-е пасяджэнне якой праведзена ў лютым г.г. у Бялградзе, дзелавы савет гандлёва-прамысловых палат, працоўныя групы па транспарце і сельскай гаспадарцы, а таксама міжурадавая змяшаная камісія па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.



Сербскія інвестары і прадпрымальнікі рэалізуюць у Беларусі шэраг інвестыцыйных праектаў, у сталіцы гэта «Маяк Мінска» і «Мінск-Мір». Беларускі інвестар праяўляе цікавасць да праекта ў Сербіі з прадпрыемствам па выпуску аўтакампанентаў «Петар Драпшын».

Бязвізавы рэжым і рэжым свабоднага гандлю паміж нашымі краінамі, безумоўна, спрыяюць дасягненню станоўчых вынікаў супрацоўніцтва.

***— Напрыклад, у адносінах Беларусі з Кітаем, а раней — з Расіяй, вялікую ролю адыгрывае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Ці робіцца штосьці ў гэтым плане ў стасунках Беларусі і Сербіі?***

— Вядома, трэба ўлічваць, што Сербія — невялікая краіна з насельніцтвам каля 7 мільёнаў чалавек (не лічачы аўтаномнага края Косава і Мятохіі), яе рэгіёны не могуць параўнацца з расійскімі або кітайскімі па маштабе і патэнцыяле супрацоўніцтва. Акрамя гэтага, Сербія — унітарная краіна, і сербскія раёны і гарады не маюць столькі паўнамоцтваў, колькі яны маюць у федэратыўных дзяржавах. Акрамя гэтага, у сербскага боку нярэдка прысутнічае і некаторая адчувальнасць да развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, звязаная з болем ад аддзялення Косава і Мятохіі, супраць якога Сербія змагаецца, у тым ліку пры падтрымцы Беларусі і іншых краін СНД, Еўропы і свету.

Між тым у апошнія гады ўдалося актывізаваць супрацоўніцтва паміж цэлым шэрагам рэгіёнаў Беларусі і Сербіі. Наладжаны і развіваюцца кантакты ў фармаце партнёрскіх і пабрацімскіх сувязяў паміж гарадамі Мінск і Бялград, Магілёў і Крагуевац, Гомель і Новы Сад, Гродна і Кралёва, Барысаў і Пажарэвац, Заслаўе і Топала, Баранавічы і Чачак, паміж Нясвіжскім раёнам і абшчынай Земун. Падпісаны дагавор паміж Мінскім аддзяленнем БелГПП і ГПП Ваяводзіны.

Гарады-партнёры абменьваюцца дэлегацыямі дзелавых колаў і адміністрацый, арганізуюць выступленні творчых калектываў. Узаемадзейнічаюць гандлёва-прамысловыя палаты.

Думаю, лагічным крокам наперад было б фарміраванне ў будучыні Асацыяцыі парадненых і партнёрскіх гарадоў Беларусі і Сербіі.

На перспектыву прапрацоўваецца магчымасць падпісання пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж Віцебскам і Нішам, Брэстам і Субоціцай, Бабруйскам і Крушэўцам, Полацкам і Срэмскай Мітравіцай, Маладзечнам і Вальевам, Салігорскам і Ягодзінай, Жлобінам і Смядзеравам, Мазыром і Вршоцам, а таксама Гомельскай вобласцю і Аўтаномным краем Ваяводзіна.

Акрамя таго, хачу адзначыць, што нацыянальныя акадэміі навук і 8 універсітэтаў дзвюх краін звязаны зараз пагадненнямі аб супрацоўніцтве.

Важным вынікам дзейнасці пасольства стала таксама тое, што пачалі працу ганаровыя консулы Рэспублікі Беларусь у г. Бялградзе (Драгамір Карыч), Аўтаномным краі Ваяводзіна (Драгалюб Швоня), Шумадзійскім рэгіёне (Зоран Вулавіч).

***— А якія культуралагічныя праекты ў планах беларускага пасольства ў Сербіі?***

— У найбліжэйшых планах пасольства — арганізацыя сумесна з сербскімі партнёрамі з Усеславянскага літаратурнага саюза мерапрыемства, прысвечанага беларускай паэзіі з акцэнтам на кнігу «Анталогія беларускай паэзіі» на сербскай мове, складзеную прафесарам БДУ Іванам Чаротам, які з'яўляецца членам Сербскай акадэміі навук і мастацтваў.

Дарэчы, па ініцыятыве пасольства Усеславянскі літаратурны саюз падпісаў дагавор аб супрацоўніцтве з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Беларускія мастакі штогод удзельнічаюць у традыцыйных пленэрах у Сербіі. Пры падтрымцы пасольства рыхтуецца да падпісання дагавор аб супрацоўніцтве нацыянальных інфармагенцтваў — БелТА і ТАНЮГ, розныя каналы беларускага тэлебачання — частыя госці ў Сербіі, а сербы ўжо сталі традыцыйнымі ўдзельнікамі мінскіх медыяфорумаў, фестываляў «Славянскі базар», «Лістапад», «Сожскі карагод».

На восень намечана экспазіцыя ў Сербіі беларускай фотавыставы, прысвечанай нашаму ўдзелу ў Першай сусветнай вайне. У нас яшчэ пакуль мала ведаюць і пішуць пра гэту вайну, мабыць, у сувязі з некаторымі балючымі ўспамінамі аб тым, як яна скончылася, — аднятай перамогай, крахам Расійскай імперыі, Брэсцкім мірам са стратай часткі тэрыторый. Сербы, наадварот, ганарацца Першай сусветнай вайной, па пераможных выніках якой было створана Каралеўства Югаславія, праводзяць шмат памятных мерапрыемстваў з нагоды 100-годдзя з пачатку вайны. Думаю, што выстава «Беларусь у Першай сусветнай вайне» прыцягне ўвагу сербскай грамадскасці.

У планах пасольства — арганізаваць сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Сербіі акцыю «100 кніг Беларусі для Сербіі». Магчыма, мы яе прымяркуем да штогадовай найбуйнейшай на Балканах Міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу ў Бялградзе ў кастрычніку, якая сёлета будзе юбілейнай — 60-й. Упэўнены, што Беларусь будзе годна на ёй прадстаўлена.

Акрамя іншага, прапрацоўваем пытанні ўдзелу нашых прадстаўнікоў у 55-м Міжнародным фестывалі трубачоў у Гучы, а таксама беларускага калектыву ў 46-м Міжнародным дзіцячым фестывалі «Радасць Еўропы» ў Бялградзе.

Прыемна адзначыць, што сумеснымі намаганнямі пакладзены пачатак супрацоўніцтву акадэмій МУС і ваенных акадэмій Беларусі і Сербіі.

У год 70-годдзя Вялікай Перамогі пасольствам праведзена некалькі юбілейных мерапрыемстваў, а таксама з выкарыстаннем спіса Міністэрства абароны Беларусі ідэнтыфікаваны пахаванні ў Бялградзе трох савецкіх воінаў — выхадцаў з Беларусі, якія па-геройску загінулі пры вызваленні Югаславіі. Хацеў бы скарыстацца выпадкам і звярнуцца са старонак газеты з просьбай адгукнуцца да сваякоў радавога Цімафеева Васіля Апалонавіча, ураджэнца г. Віцебска; лейтэнанта Асіпоўскага Аляксандра Міхайлавіча, ураджэнца г. Орша; старшага лейтэнанта Саламахі Дзмітрыя Ільіча, ураджэнца Баярскага сельсавета Полацкага раёна (на мемарыяле пазначана званне капітана). Заўважу, што сваякі палеглага ў баі за вызваленне Бялграда беларуса капітана А.П. Дуброўскага ўжо двойчы наведвалі Сербію.

Я вельмі ўдзячны газеце і Выдавецкаму дому «Звязда» за пастаянны інтарэс да будняў беларускай дыпламатыі, а таксама да Сербіі. Спадзяюся, што і надалей ваша аўтарытэтнае выданне будзе публікаваць матэрыялы пра гэту славянскую праваслаўную краіну, з якой у нас ёсць шмат агульнага, і пра пашырэнне ў ёй беларускай прысутнасці.

**Гутарыў Кірыл ЛАДУЦЬКА.**

*Бялград—Мінск.*

## Адрасы дабрачыннасці

**Фотаздымак падлеткаў каля акон з кратамі не сведчыць пра тое, што іх лёс складваецца добра. Нават калі гэтыя краты выкаваныя па-мастацку, як у прыёмніку-размеркавальніку для няпоўнагадовых УУС Мінаблвыканкама. Але ёсць на фотаздымку і добры знак надзеі: падлеткі, якія часова знаходзяцца ў гэтых сценах, не засталіся сам-насам са сваімі зусім не дзіцячымі жыццёвымі праблемамі.**



Фотаздымак зроблены днямі ў час, калі да насельнікаў размеркавальніка прыехалі прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы і аб'яднанай прафсаюзнай арганізацыі Міністэрства ўнутраных спраў. Размова дарослых гасцей з юнымі насельнікамі гэтай строгай установы атрымалася ўзаемна шчырай. Пра ўсё, што было з падлеткамі раней, дарослыя далікатна не дапытваліся (каму трэба — той ужо ведае), а вось як жыць далей — абмяркоўвалі ажыўлена. Пратадыякан Яраслаў Блізнюк прывёў прыклады, як аднагодкі суразмоўцаў займаюцца ў праваслаўнай нядзельнай школе, якой ён кіруе, захоплена ўдзельнічаюць у выступленнях аматарскага тэатра, ладзяць цікавыя экскурсіі. **Старшыня аб'яднанай прафсаюзнай арганізацыі МУС Святлана ХУРС** расказала, як яе калегі збіралі для падлеткаў падарункі — спагадліва дзяліліся хатнім дзіцячым адзеннем, прыносілі сшыткі, каляровыя алоўкі, кнігі. Адна супрацоўніца нават вырашыла перадаць у размеркавальнік неблагую швейную машынку. Маўляў, трапляюць жа ў тыя сцены часам і дзяўчынкі — няхай сабе практыкуюцца.

Асобна трэба дадаць, што Дэпартамент выканання пакаранняў таксама прыняў удзел у гэтай дабрачыннай акцыі — выдаткаваў грошы, за якія для падлеткаў у размеркавальніку набылі рэчы першай неабходнасці.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

# «ФРАНЦЫСК СКАРЫНА І ЯГО ЧАС»

## Дзе шукаць новае?..

**Скарына — асоба надзвычай велічная, якая мае выключнае значэнне не толькі для нашай гісторыі, але і сучаснасці. Распачаўшы першым кнігадрукаванне на ўсходнеславянскіх землях, ён дазволіў нам апынуцца ў гэтай справе наперадзе многіх суседніх краін. Павялічыўшы адукацыйныя магчымасці простых людзей, ён імкнуўся наблізіць іх таксама і да Бога — невыпадкова першымі надрукаванымі ў нас кнігамі сталі тэксты Свяшчэннага Пісання.**

**Крыху спрасціўшы мову, ён зрабіў гэтыя кнігі больш прывабнымі для чытання, тым самым пашыраючы асвету на нашых землях. Уладзімір Караткевіч пісаў: «Подзвіг Францыска Скарыны дагэтуль не ацэнены. Не ацэнены таму, што мы пачасту глядзім на яго эпоху вачамі сённяшняга дня, забываючыся часам зірнуць на яе вачамі сучасніка Скарыны. Зірнуць на яе знутры, нібы сам жывеш у тыя часы, і многае, што для нас цяпер рэч натуральная, усмактанае ледзь не з малаком маці, само сабой зразумелае — для цябе яшчэ цёмны лес...» Сапраўды, нам цяжка ўявіць, што такое быць першым — першадрукаром, першым асветнікам, першым сярод хрысціянін, што цяпер стаіць па-над канфесіямі...**

Падзяліцца сваімі напрацоўкамі па даследаванні жыцця і дзейнасці Францішка Скарыны на VI Міжнародным кангрэсе беларусістаў з'ехаліся даследчыкі не толькі з Беларусі, але і Расіі, Украіны, Польшчы, Англіі. На «круглым стале», арганізаваным з гэтай нагоды, гучалі смелыя думкі, прапановы, адбываліся спрэчкі — атмасфера падагравалася і тым, што да святкавання 500-годдзя пачатку ўсходнеславянскага кнігадрукавання, распачатага Скарынам, засталося ўжо менш за два гады.

### ДОКТАР СІМАНС ВЕДАЎ ПРА БЕЛАРУСЬ

Аказваецца, даследаваннямі дзейнасці беларускага першадрукара актыўна займаўся і вядомы заходнееўрапейскі навуковец XX стагоддзя доктар Джон Сіманс. Пра гэта паведамілі расійскія навукоўцы — **кандыдат філалагічных навук Расійскай акадэміі навук Ларыса ШЧАВІНСКАЯ і акадэмік Дзяржаўнай акадэміі славянскай культуры Юрый ЛАБЫНЦАЎ.**

Джон Сіманс працаваў у Оксфардскім універсітэце, быў актыўным прапагандыстам ведаў пра ўсходніх славян у Заходнім свеце. Яго артыкулы часта з'яўляліся ў вядомым на той час славістычным часопісе «Oxford Slavonic Papers», у тым ліку прысвечаныя гісторыі беларускага кнігадрукавання. Наша краіна яму была цікавая тым, што менавіта адсюль паходзіў усходнеславянскі першадрукар. Юрый Лабынцаў адзначыў:

**Фігура Скарыны настолькі загадкавая, што вялікую цікавасць выклікае не толькі яго жыццё, але і абставіны смерці... Аднак ні дакладная дата смерці, ні месца пахавання дагэтуль не вядомы.**

— Першая буйная праца Сіманса, у якой гаворка ішла пра цэлы шэраг невядомых беларускіх старадрукаваных кірылічных выданняў, з'явілася ў 1951 годзе. У публікацыі падрабязна характарызуецца некалькі вучэбных беларускіх кніг, у асноўным віленскага друку XVI — першай паловы XVII стагоддзя, у тым ліку буквары, граматыкі. Асаблівы інтарэс уяўляе «Часасловец». Па сутнасці, гэта загадкавае выданне трэцяй чвэрці XVI стагоддзя, у якім выкарыстаны не толькі шрыфты, але і ініцыялы Францішка Скарыны. Цяпер у свеце налічваецца 3 экзэмпляры гэтага выдання, але мы па-ранейшаму мала што можам дадаць пра абставіны яго выхаду ў свет. Для спецыялістаў застаюцца загадкавымі і некалькі дэфектных, хутчэй за ўсё віленскіх, беларускіх часасловаў XVI — першай паловы XVII стагоддзя. Яны адзінкавыя, захаваліся толькі ў брытанскіх бібліятэках, маюць на сабе шматлікія сляды іх ужывання ў побыце. Таксама ўнікальны і Віленскі «Буквар» 1596 года, набраны адным з шрыфтоў так званых «Віленскіх лістоў». Ён выклікае вялікую цікавасць навукоўцаў, прыцягвае ўвагу да скарынаўскай праблематыкі, у прыватнасці, выкарыстання яго друкарскага матэрыялу ў больш позні час.

### НАЙПЕРШ ХРЫСЦІЯНІН

Даследчыкі не абышлі ўвагай і веравызнанне першадрукара. Аднак да якой бы канфесіі ён ні належаў, можна сказаць, што гэтая асоба здольна аб'яднаць усіх. Сваю думку з гэтай нагоды выказаў **доктар гістарычных навук з Інстытута гісторыі НАН Беларусі Георгій ГАЛЕНЧАНКА:**

— Францішак Скарына працаваў сакратаром Віленскага каталіцкага епіскапа. Гэта было б немагчыма, каб ён належаў да іншай канфесіі. Таму выснова, што ён быў католіком, падаецца лагічнай. Аднак іншая справа, што ён сапраўды з'яўляўся хрысціянінам. Для Скарыны ідэя хрысціянства была вышэйшай за канфесійнае размежаванне.

Ёсць даследчыкі, схільныя адносіць Скарыну да іншага веравызнання. Такія думкі гучалі і раней па-за межамі гэтага «круглага стала», але іх варта прыгадаць. Протаіерэй Сяргей Горбік з Кіеўскага Патрыярхата ў сваёй публікацыі «Ці выкарыстоўваліся тэксты Францішка Скарыны ў богаслужбовай практыцы» разважае, што першадрукар распачынаў сваю перакладчыцкую і выдавецкую дзейнасць, найперш думаючы аб практычным выкарыстанні сваёй працы праваслаўнымі вернікамі Вялікага Княства Літоўскага — Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі. Бо толькі праваслаўныя карысталіся кірылічным шрыфтам і ўжывалі царкоўнаславянскую мову (або мясцовы ўзор царкоўнаславянскай мовы) у службах.

У той жа час даследчык, пратэстанцкі святар з Мінска Антоній Бокун у артыкуле «Гісторыя перакладу Бібліі на беларускую мову» адзначае: «Уніяцкі мітрапаліт Антоній Сялява назваў Скарыну «ератыком гусітам», а выдадзеную ім Біблію разглядаў як пачатак Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім». Ён таксама дадае, што царкоўна-славянская мова выкарыстоўвалася як найбольш звыклая для чытача. А беларускі навуковец канца 60-х гадоў XX стагоддзя Аркадзь Жураўскі ўдакладняе, што мова перакладаў Скарыны з'яўляецца пераходнай ад класічнай царкоўнаславянскай да старабеларускай.

### ПРАЎДУ АДКРЫЮЦЬ АРХІВЫ

Вяртаючыся да пасяджэння, можна адзначыць, што для асабліва цікаўных там прагучалі ўказанні на тое, дзе можна шукаць магчымыя новыя звесткі пра першадрукара.

**Прафесар, ганаровы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Адам МАЛЬДЗІС** раздаў своеасаблівыя «заданні» навукоўцам і даследчыкам. Па-першае, пашукаць звесткі пра Скарыну ў архівах Санкт-Пецярбурга, бо туды ў 1830-я гады, ліквідуючы каталіцкі ордэн у Полацку, маглі вывезці дакументы, звязаныя з ім. Па-другое, пацвердзіць гіпотэзу паходжання рускага першадрукара Івана Фёдарава (магчыма, паслядоўніка Скарыны) з Вілейшчыны. Праліць святло на гэта пытанне маглі б дапамагчы росшукі ў архіве Кракаўскага ўніверсітэта, бо там, аказваецца, вучыўся Фёдараў. Даследаваць гэтае пытанне Мальдзіс прапанаваў асабіста аўтарцы гэтага артыкула (бо 19 сакавіка 2013 года «Звязда» ўжо пісала пра верагоднасць таго, што рускі першадрукар паходзіў з Вілейшчыны).

**Для Скарыны ідэя хрысціянства была вышэйшай за канфесійнае размежаванне.**

Фігура Скарыны настолькі загадкавая, што вялікую цікавасць выклікае не толькі яго жыццё, але і абставіны смерці. Вымушаны пакінуць Радзіму, апошні спачын ён, верагодна, знайшоў у Празе. Аднак ні дакладная дата смерці, ні месца пахавання дагэтуль не вядомы. Магчыма, знайсці гэтыя звесткі дапамогуць архівы Ватыкана. Навукоўцы, што валодаюць італьянскай і лацінскай мовамі, маглі б звярнуцца туды і пашукаць новыя звесткі пра Скарыну.

### «НА МОВАХ НАРОДАЎ СВЕТУ»

Спадчына, пакінутая першадрукаром, актыўна пераасэнсоўваецца і сёння, знаходзіць увасабленне ў новых выданнях. На «круглым стале» былі прэзентаваны некаторыя з іх. Узноўленую па тэхналогіі XVI стагоддзя кнігу Быцця Францішка Скарыны прадставіў **гісторык, калекцыянер Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ.**

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** расказаў пра выданне «Францыск Скарына на мовах народаў свету». Ён выступіў укладальнікам гэтага праекта. У кнізе сабраны пераклады прадмовы да кнігі «Юдзіф» на 64 мовы. У перакладзе на сучасную беларускую мову, зробленым паэтам Алесем Разанавым са старабеларускай, яна гучыць так: «Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць схованы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае — гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць». Будзем жа памятаць запавет Скарыны. Будзем па-новаму адкрываць яго для сябе.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Тэхналогіі

## Інтэлектуальныя пасведчанні для разумных людзей

**Цырымонія падпісання пагаднення аб выпуску першай партыі інтэлектуальных пасведчанняў для супрацоўнікаў прайшла ў Белдзяржуніверсітэце. Яно распрацавана спецыялістамі БДУ, Белінвестбанка і групай беларускіх прыватных кампаній на аснове міжнароднай плацежнай карткі Master Card.**

Інтэлектуальнае пасведчанне ўяўляе з сябе пластыкавую картку, на якую наносяцца фатаграфія і тэкст, якія ідэнтыфікуюць супрацоўніка візуальна. На кантактным мікрачыпе запісваюцца плацежны дадатак і дадатак электроннага лічбавага подпісу. Картка таксама змяшчае бескантактавы чып для радыёчастотнай ідэнтыфікацыі (RFID-пазнака).

Пасведчанне будзе выкарыстоўвацца як зарплатная банкаўская картка, з дапамогай якой можна ажыццяўляць плацяжы ў нашай краіне і за мяжой. А электронным лічбавым подпісам можна скарыстацца ў сістэме электроннага дакументазвароту БДУ.

Радыёчастотная ідэнтыфікацыя выкарыстоўваецца ў БДУ з 2003 года ва ўнутрыўніверсітэцкіх інфармацыйных сістэмах, для арганізацыі прапускной сістэмы і размежавання доступу ў памяшканні. Тады ў БДУ быў укаранёны першы ў Беларусі інтэлектуальны студэнцкі білет на аснове высокіх тэхналогій.

Распрацоўка інтэлектуальнага пасведчання супрацоўніка БДУ — чарговы пілотны праект вядучай ВНУ краіны ў галіне ідэнтыфікацыі і аўтэнтыфікацыі фізічных асоб. Інтэлектуальнае пасведчанне супрацоўніка БДУ распрацоўвалася на прынцыпах дзяржаўна-прыватнага партнёрства, што дазволіла рэалізаваць праект у кароткія тэрміны і не запатрабавала фінансавых выдаткаў з боку дзяржавы. Гэта адзін з першых прыкладаў эфектыўнага выкарыстання дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы высокіх тэхналогій.

Доследны ўзор пасведчання быў адзначаны дыпломам на міжнародным спецыялізаваным форуме па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІВО-2014».

Першыя 100 пасведчанняў супрацоўнікі БДУ атрымаюць ужо ў гэтым месяцы. А ў новым навучальным годзе плануецца пачаць масавае выкарыстанне новых дакументаў, якія з'яўляюцца носьбітамі электроннага лічбавага подпісу, што паскорыць працэс зацвярджэння вучэбнай дакументацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**


**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОБЩЕСТВЕННОГО ОБЪЕДИНЕНИЯ «ФУТБОЛЬНЫЙ КЛУБ «ДИНАМО-БРЕСТ» ЕДИНЫМ ЛОТОМ**

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Объекты недвижимого имущества, расположенные по адресу: Брестская область, г. Брест, ул. Леваневского, д. 7, на земельном участке пл. 0,1821 га с кадастровым номером 140100000001020122:<br>- Капитальное строение (инв. № 100/С-392), административно-хозяйственное здание, общей площадью 631,8 м²;<br>- Капитальное строение (инв. № 100/С-397), здание специализированное автомобильного транспорта, общ. пл. 77 м²;<br>- Водопроводная сеть, инв. № 89, протяженность 15,6 м.п.;<br>- Тепловая сеть, инв. № 88, протяженность 58 м.п.;<br>- Канализационная сеть, инв. № 90, протяженность 15,6 м.п.;<br>- Сеть электроснабжения, инв. № 91, протяженность 82 м.п.;<br>- Покрытие асфальтобетонное, инв. № 80, общ. пл. 896 м²;<br>- Забор кирпичный, инвентарный номер 81, длина 26,9 м;<br>- Забор кирпичный, инв. № 82, длина 75,8 м;<br>- Ворота металлические, инв. № 84, длина 4,85 м, высота 2 м;<br>- Ворота металлические, инв. № 85, длина 4,85 м, высота 2 м;<br>- Забор деревянный, инв. № 82, длина 23 м. | 13 395 243 039 | 669 762 152 |
| Местонахождение объекта | Брестская область, г. Брест, ул. Леваневского, д. 7 | | |
| Права на земельный участок | Право постоянного пользования | | |
| Условия продажи | Без условий | | |
| Обременения | Нет | | |
| Продавец (Балансодержатель) | Общественное объединение «Футбольный клуб Динамо-Брест» | | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| Условия оплаты | в соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| Номер р/сч для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб.РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 | | |

**Аукцион состоится 08 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: г.Брест, ул.Наганова, д.10, к.325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» БОУ**

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам — резидентам Республики Беларусь — копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица — доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам — нерезидентам Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица — доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям — копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя — доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам — представителю физического лица — доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов — Организатору аукционных торгов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений — 07 июля 2015 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (029) 626-72-52; 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 19 (276)

■ Кінакрокі

# ЗА СПРАВУ БЯРУЦЦА «ЗНАТАКІ»

## Яны абяцаюць прадставіць пяць новых фільмаў ужо ў кастрычніку

**Шмат кажуць пра стагнацыю беларускага кіно, пра адсутнасць нашых фільмаў на міжнародных кінафестывалях, пра страту пакалення, якое магло б даць плеяду таленавітых аўтараў, і гэтак далей. Усвядоміўшы жахлівае становішча гэтай сферы, каманда «экспертаў» паспрабавала скааперыраваць сілы дзеля таго, каб гэта змяніць. Вядома ж, да лепшага. Таму заснавальнікам — Майстэрняй сацыяльнага кіно — аб'яўлены пачатак праекта KINOSPRINT.**

На арэну конкурсу выйшлі вядомыя дзеячы беларускай кінапрасторы — прадзюсар «БелФільм Групы» Юрый Ігруша, прадзюсар New wave production Аляксандр Левянчук, сцэнарыст Андрэй Курэйчык, дырэктар Кінашколы-студыі Андрэй Палупанаў, дырэктар rental-кампаніі FIRST RENTAL Сяргей Якубоўскі і іншыя, а таксама арганізацыі, якія стаяць за некаторымі імёнамі (у якасці сузаснавальнікаў). Конкурс прапаноўвае маладым талентам тэму экалогіі, на якую ўдзельнікі павінны будуць стварыць ідэю, сінопсіс, сцэнарый і ўласна кароткаметражны фільм. Заяўкі на ўдзел ахвотныя могуць падаць да 29 чэрвеня (на сайце kinosprint.by), з іх эксперты адбяруць дзесяць каманд, для якіх адкрыецца ўнікальная адукацыйная праграма — майстар-класы, кансультацыі дзеля падрыхтоўкі да пітчынгу. Абарона сваіх праектаў дзесяццю ўдзельнікамі адбудзецца 18 ліпеня, пасля чаго застанецца пяць каманд, якія атрымаюць магчымасць зняць фільмы і «прасунуць думкі экаактывістаў з дапамогай кіно».

Генеральны прадзюсар «БелФільм Групы» Юрый Ігруша кажа, што неабходнасць вопытным людзям сабрацца разам, каб падтрымаць маладое кіно, наспела даўно: «Мы страцілі практычна цэлае пакаленне, і, каб не страціць будучыню, трэба ўжо сёння сур'ёзна займацца. Спадзяюся, што аб'яднанне намаганняў у гэтай сферы прывядзе да цікавых вынікаў, на гарызонце з'явяцца новыя імёны і іх работы. Маладым кінематаграфістам трэба дапамагаць на ўсіх стадыях, у тым ліку прадзюсіраваць, прасоўваць фільмы. Я часта сутыкаюся з тымі, хто займаецца кароткім метрам і не мае сіл на другі фільм, таму што не адчувае вынікаў. У найлепшым выпадку карціна трапляе на нейкі фестываль. А праштурхоўванне беларускага кіно — гэта сістэмная работа».

Сапраўды, каманда не збіраецца спыняцца на стварэнні фільмаў, якія будуць прадстаўлены публіцы ўжо ў кастрычніку і сярод якіх вызначыцца пераможца. На працягу года пасля прэзентацыі вынікаў будзе ажыццяўляцца работа па прасоўванні карцін на замежныя кінафестывалі і закрытыя паказы.

**Конкурс прапаноўвае маладым талентам тэму экалогіі, на якую ўдзельнікі павінны будуць стварыць ідэю, сінопсіс, сцэнарый і ўласна кароткаметражны фільм.**

Галоўнае, што прапаноўвае KINOSPRINT маладым талентам (насамрэч узроставае абмежаванне дыктуе прыходзіць у праект проста не маладзейшым за васямнаццаць гадоў), — гэта рэсурсы для стварэння свайго фільма (не грошы, але можна прыцягнуць дадатковых спонсараў), навучанне каманднай працы, куратарства вопытных спецыялістаў і свабода творчасці.

На апошняе я спадзяюся таксама, таму што жаданне зрабіць крок у выхаванні новага пакалення выбітных беларускіх кінематаграфістаў, першапачаткова абмяжоўваючы іх тэмай, падаецца сумніўным. Няхай і слова «экалогія» даволі шырокае. Такім жа чынам у гэтым годзе прайшоў конкурс у Міністэрстве культуры — названы тэмы, сацыяльная абумоўленасць, пітчынг. У гэты час у сталах ляжаць, магчыма, шыкоўныя ідэі, гатовыя сцэнарыі.

Канстанцін Варабей, старшыня аргкамітэта, намеснік дырэктара Майстэрні сацыяльнага кіно (нагадваю, арганізацыі-заснавальніка праекта KINOSPRINT), кажа: «Як новая арганізацыя на беларускім кінарынку, Майстэрня ставіць сваёй мэтай развіццё сацыяльнага кіно і рэкламы, а місіяй з'яўляецца аб'яднанне кінематаграфістаў дзеля таго, каб рухаць наш кінематограф разам. Без партнёраў у гэтай справе цяжка, таму праект з'яўляецца добрым прыкладам, які паказвае, як увесь беларускі рынак можа аб'яднацца для дапамогі маладому кіно».

І хоць ідэя гучыць дастаткова пафасна і саманадзейна, мы ўсё ж такі спадзяёмся на тое, што праект спрацуе. Наступны раз KINOSPRINT прагучыць на старонках газеты ў кастрычніку, калі мы зможам ацаніць вынікі.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Юбілеі

# МілаГУЧНАСЦЬ асабістага

**Днямі паэт Васіль Зуёнак адзначыў 80-годдзе. І мы адзначаем — разам з ім, але яго вершамі. Што можа сказаць пра паэта лепш, чым яго творы? У іх яго мудрасць і вера ў жыццё. У іх і радасць спасціжэння шляху: зямнога, але і бясконцага, жыццёва-чалавечага, але бязмежна-творчага. Шляху паэта, які атрымаў іскрынку таленту звыш і здолеў зрабіць так, каб яна гарэла як мага даўжэй дзеля іншых. Таму што паэт, нават калі гаворыць пра тое, што дарагое ці баліць асабіста яму, піша наогул пра чалавека як пра істоту, якая на гэтым свеце шукае праўды, ісціны, любові, вечнасці праз свае справы. Васіль Зуёнак гаворыць тое, што адчувае, тымі словамі і на той мове, якая нібыта благаславёная для паэзіі: сэнс узмацняецца і арганічна кладзецца на душу праз прыгажосць і мілагучнасць. Часам здаецца, што гэта сардэчная малітва. Вельмі асабістая. Але хто не захоча яе прамовіць за ім?**

Васіль ЗУЁНАК

### АДМАЎЛЕННЕ АД РАЮ

*Стаміўся дзень, пытаецца дарога:*
*— Куды, куды спяшаешся, нябога?*

*Як многа ўсіх — і ні душы наўкола,*
*І ты — як на жніўі забыты колас:*

*Які самотны і які маўклівы,*
*Які бяздомны без жытнёвай нівы...*

*Асенні дзень схіляецца да ночы —*
*Даецца ён, каб зразумець аднойчы,*

*Як дорага жыццё на схіле веку,*
*Адпушчанае небам чалавеку:*

*Адно імгненне, а ўжо рай бліжэй,—*
*Імгненне, што за вечнасць даражэй...*

* * *

*Усё зямное мне ўсявышняй сілай*
*Даравана, каб жыў я па-зямному,*
*Каб небыццё не страшыла магілай,*
*Каб лёс мой роўны быў сабе самому.*
*Каб у бядзе намог не пахіснуцца,*
*А ў радасці не гойсаць ачмурэла...*
*Адно б — з самім сабой не размінуцца*
*І верыць, што яшчэ не звечарэла.*
*Пылінка ў чалавечым акіяне —*
*Ды хто мой дух зняволіць у аброці?!.*
*І толькі перад Богам пакаянне*
*Прыму ў сваёй грахоўнай адзіноце.*

* * *

### УРОК

*Зорныя Мядзведзіцы сярпамі*
*Дажынаюць постаць на юры.*
*Складваю снапы гадоў тарпамі —*
*А жыццё не вывучыў на памяць...*
*Божачка, урок мне паўтары!..*

■ Прэм'ера

# СЯМЕЙНЫЯ ПАРТРЭТЫ, У ЯКІХ МОЖНА ПАЗНАЦЬ СЯБЕ

## І ўбачыць каханне даўжынёй у пяцьдзясят гадоў

**У апошнія дні мая Рускі драматычны тэатр імя Горкага прадставіў прэм'еру спектакля «Вечнасць на дваіх», створанага па рамане Джазэфіны Лоўрэнс «Гады такія доўгія». Гэта гісторыя пра, здаецца, заўсёдныя пытанні ўзаемаадносін унутры сям'і — бацькоў з дзецьмі і тых, хто і без кроўнага сваяцтва стаў найбліжэйшым для некага чалавекам. Напэўна, у справе апошніх пра свой удзел заяўляе Каханне, якое таксама прэтэндуе на вечнае жыццё. І ў гэтым бачыцца адзіны сэнс назвы — гэты спектакль не пра «вечнае» ў высокім сэнсе слова, а пра вечныя праблемы, пастаяннае вяртанне да пункта адліку, што адмяняе прагрэс чалавечай душы, і пра вечнае каханне, якое ў момант стварае гэты прагрэс лакальна. Рэжысёрам стаў Барыс Луцэнка, які шмат гадоў быў мастацкім кіраўніком Рускага тэатра.**



Сустрэча ў фамільным доме: Барк з Люсі *(пасярэдзіне)* і чацвёра дзяцей — Эвелін, Джордж, Рычард і Нэлі.

Дзейных персанажаў можна падзяліць на дзве групы. Адасабляем дваіх галоўных — гэта Барк і Люсі Купер, сужэнцы, у якіх за плячыма пяцьдзясят гадоў сумеснага жыцця, гадавання пяці дзяцей і росту агульных даўгоў. У спектаклі іх іграюць Расціслаў Янкоўскі з Бэлай Масумян і Аляксандр Брухацкі з Людмілай Былінскай. Іх вобразы асвятляюць сапраўдныя пачуцці, бесперапынны і амаль аўтаматычны клопат адно пра аднаго, ужо ў першай сцэне прадэманстраваны цудоўныя адносіны, быццам пасля першага прызнання пад месяцам.

У вялікі сямейны дом з'язджаюцца чацвёра дзяцей (яшчэ адна дачка застаецца «за кадрам») — яны становяцца другой групай персанажаў. Чым жа яны адметныя? Засяроджанасцю на сваім жыцці і сваіх праблемах, абыякавасцю, нежаданнем аддаць своеасаблівы доўг бацькам.

Самае галоўнае, што гэты эгаізм — здавалася б, бяскрыўдная якасць — становіцца крыніцай паўсюднага нараджэння болю і крыўды, пачуцця адзіноты ў Барка і Люсі, якія ў сваю чаргу ўсё матэрыяльнае і нематэрыяльнае аддалі дзецям. Але гэта пасля.

Хутка раскрываецца нагода, з прычыны якой бацькі тэрмінова запрасілі дзяцей: банк збіраецца забраць у сваю ўласнасць сямейны дом, які быў закладзены пяць разоў (роўна столькі, колькі патрабавалася выдаткоўваць на навучанне дзяцей). Барку і Люсі няма дзе жыць (але ж яны маюць пяцёра дзяцей). Гэта навіна перапыняе разважанні старэйшага Джорджа пра спадчыну і дае размове дыяметральна іншы накірунак. Дзеці здзіўляюцца, чаму бацькі не змаглі за ўсё жыццё назапасіць грошай на забяспечаную старасць і ўвогуле чаго яны хочуць? І тут цягнецца — «у маім доме праводзяцца спірытычныя сеансы», ці «я ўсё выдаткоўваю на лекі», ці «я адна выхоўваю непаўналетнюю дачку».

У выніку, цаной глыбокага расчаравання з боку бацькоў і суровага асуджэння з боку гледача, сям'я дамовілася, што Джордж можа дапамагчы... але толькі аднаму. І пажадана, каб маці.

Далейшыя падзеі — гэта, умоўна кажучы, хаджэнне па пакутах дваіх састарэлых людзей. Галоўнае, што яны бацькі і што ўяўляюць яны з сябе дзве паловы аднаго цэлага, якія захавалі сваё каханне. То бок жылі пяцьдзясят гадоў, гадавалі дзяцей, а нарэшце павінны разлучыцца праз тых жа дзяцей. Таму ўсе пяцёра выступаюць тут у першую чаргу не як родныя, а як катавальнікі і крыніцы своеасаблівага тэрору, хай гэта і гучна сказана.

Структура спектакля — ён доўжыцца тры гадзіны — як быццам зразумелая. Барк і Люсі жывуць то ў аднаго, то ў другога з дзяцей паасобку і ніяк не могуць аказацца разам.

**Усе пяцёра дзяцей выступаюць тут у першую чаргу не як родныя, а як катавальнікі і крыніцы своеасаблівага тэрору, хай гэта і гучна сказана.**

Праз гэта адначасна паказваюцца і самадастатковыя лініі — партрэты трох тыповых сем'яў. Вось вам працавіты, амбіцыёзны «гаспадар жыцця» Джордж і яго жонка Аніта, што ад нудоты і адсутнасці пастаяннага занятку прыдумала сабе захапленне спірытызмам. Быццам, пры справе.

Вось Эвелін і яе звычайнае замужжа з Леанарда — простым, сціплым, спакойным і прыязным да цесця чалавекам. Сям'я не лепшая, не горшая за іншыя, але, калі глядзіш на пастаянную незадаволенасць Эвелін, здаецца, што яе жаданні і мары не спраўдзіліся. А з прычыны яе істэрычнасці пакутуе муж, якога жыццё якраз задавальняе (задавальняла б).

Вось Нэлі, якая засталася без мужа, будуе сяброўскія адносіны са сваёй дачкой і чакае ад яе абсалютнай шчырасці. А калі ў гэтым з'яўляецца прарэх, Нэлі без сумнення вінаваціць маці, якая ў гэты час жыве ў яе доме. Кожны прыклад — тыповы, у нейкім сэнсе саркастычны, заганны.

Але цэнтральнай лініяй, зразумела, застаецца вандраванне Барка і Люсі, усё астатняе — другаснае, функцыяй іншых персанажаў з'яўляецца стварэнне фону, асяроддзя і генерацыі абыякавасці. Яны не ствараюць драм, не перажываюць страт, не церпяць выпрабаванняў. На іх пачуццях не засяроджваешся, не пранікаешся, не спачуваеш. Таму што з самага пачатку яны трапілі ў кола «грэшнікаў». Толькі Нэлі з пяці дзяцей з «фону» чамусьці выбіваецца і трапляе ў сваю ўласную гісторыю, асобную лінію.

Рэжысёр змясціў п'есу пад словы «сусвет» ці «вечнасць» — над сцэнай узвышаецца экран з выявамі космасу. «Сусвет», у параўнанні з якім нашы мімалётныя (а для нас — глабальныя) праблемы выглядаюць яшчэ больш мізэрнымі, чым нават наша жыццё. «Вечнасць», у якую тут упісваецца толькі Каханне, а ўсё іншае застаецца людской мітуснёй. Ці тая «вечнасць», якой для Барка і Люсі аказаўся час расстання. Ці тая, што нам забяспечваецца працягам роду.

Так ці інакш, вечнасцю тут аказваецца сам спектакль — не заўсёды здаецца матываваным бясконцае кружэнне над сцэнамі сямейнага жыцця, не кожны паварот круга абяцае дакладнае служэнне адной ідэі, а партрэты сем'яў, узаемаадносіны бацькоў і дзяцей, абсурднасць створанай сітуацыі цікавыя тут толькі знешне, але сшыты не з тых матэрый, што здольны закруціць у сваё маральнае самавыяўленне. Затое кантраст паміж старэйшым і малодшым пакаленнем тут паказаны дакладна. І яму не абавязкова азначацца выявамі сусвету. Ці сустрэнуцца нарэшце Барк з Люсі, ці ўсвядомяць дзеці заганнасць сваіх учынкаў, глядач даведаецца ў канцы. Але падказваю: рэжысёр настроены аптымістычна, хоць аптымізм гэты ляжыць не на паверхні.

**У выніку, цаной глыбокага расчаравання з боку бацькоў і суровага асуджэння з боку гледача, сям'я дамовілася, што Джордж можа дапамагчы... але толькі маці.**

Засталося толькі пытанне: вакол чаго менавіта круціцца ідэя татальнай несправядлівасці? Сапраўднае каханне? Ці прывычка, арганічная неабходнасць быць да некага прывязаным, дыктат лёсу, абставін?.. Як правільна назваць адносіны Барка і Люсі? Як правільна назваць адносіны, у якіх фігуруем мы самі? Ці існуе ў іх нешта, параўнальнае з космасам і вечнасцю?

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Выстава

# ЯК ЗАЎСЁДЫ, ГУЛЬНЯ ВОБРАЗАЎ

## Графіка ці жывапіс? І першае, і другое ад Сяргея Балянка

**Спачатку ружовы трусік прашмыгне міма ног, потым чорны цень, падобны да капелюша, накрые зверху — усяго толькі згадка пра лямпу, якая можа жыць сваім жыццём. Запрашаюць прайсці будынкі, за якімі хаваюцца сны... Неверагодныя павароты падчас гульняў уяўлення падрыхтаваў мастак, для якога гэта — «Усё як заўсёды».**

Вялікая зала Музея сучаснага выяўленчага мастацтва яшчэ чакае тых, хто прамінуў персанальную выставу мастака Сяргея Балянка. І хоць прыхільнікі выяўленчага мастацтва, можа быць, носяць у сабе вобразы мінулай выставы (адбылася летась у гэтым жа музеі), варта працягнуць знаёмства. Мала таго, выстава — гэта той асаблівы фармат зносін з творцам, калі можа выстройвацца дыялог, наладжвацца разуменне, умацоўвацца знаёмства, калі ўжо вядомае знаходзіць падмацаванне ці ўдакладненне. Вось якраз падмацаваннем і ўдакладненнем свайго ўспрымання творчасці Сяргея Балянка можна назваць гэтую выставу. Тым больш што ён і сам нібыта разумее гэта, нават назва экспазіцыі красамоўная: «Усё як заўсёды».



Перасохлае лета.

Усё ды не ўсё. У назве, хутчэй, схаваны момант гульні: каб узгадвалі, пазнавалі стыль і вобразы, але думалі глыбей і адпаведна захапляліся тым, які неверагодны свет можа насіць у сабе чалавек. Прычым кожны. Іншая справа, што не ўсе здольныя потым адлюстраваць свае дзіўныя, неверагодныя сны, мроі, фантазіі, вобразы, якія часам выплываюць з падсвядомасці і накрываюць цябе так, што пачынаеш ужо думаць: а ці не рэальныя яны?

Большасць — шэрыя. Не чорна-шэрыя. Можа, шэра-белыя. Ці ўсё ж чорнае з белым імкнуцца спалучыцца, сплесціся ў гармоніі праз шэрае. Гэта афорты Сяргея Балянка — тое, што ён як мастак-графік найперш умее і любіць рабіць (выпускнік Львоўскага паліграфічнага інстытута). Дарэчы, той, хто любіць чытаць, мог сутыкацца з яго творамі — у кнігах, якія ён афармляў (гэта, дарэчы, асобны перыяд у біяграфіі, калі мастак быў звязаны з працай у мінскіх выдавецтвах). Але ілюстрацыя да кнігі заўсёды прывязана да сюжэту, да вобразу, закладзенага пісьменнікам. А ёсць жа і свае вобразы, якія просяцца, каб іх выпусцілі ў самастойнае жыццё. Калі ласка, ён гэта робіць. Выпускае.

І вось яны асвоілі выставачную прастору. Запрашаюць нас да гульні. Спачатку бачыш твор — той самы манахромны афорт. Потым пераводзіш погляд на назву. І ўсё — ты ўжо Аліса ў нейкім залюстаркоўі. Яно рэальнае! Трэба націснуць кнопку ў сваёй галаве: ну, няўжо не відаць, што трусік сапраўды ружовы? Дадаць уяўлення — і ўсё становіцца на месца, мастак не хлусіць.

**Калі пойдзеце адсюль, вас будуць праследаваць самотныя каты, пінгвіны ці цені. Прычым з колерамі на выбар.**

Калі вы гэта разумееце, гуляць становіцца яшчэ цікавей — вы ўжо паўнапраўны сутворца, які на чорна-шэрае-белае можа ў вольнай форме накладваць колеры, можа мысленна дапаўняць ці працягваць твор, кіруючыся ўласным ладам жыцця ці логікай. Вось, напрыклад, цікава прадоўжыць лагічны шэраг твора «Заўчарашні цень ціха ішоў дадому». Але ж як гэта можна патлумачыць, пра што твор, калі ўсё на нюансах, на здагадках, на гумары? Ну прычым там рыбіны да ценю? Ці вось яшчэ ўявіце: цёмна, толькі самотны кот бадзяецца на вуліцы... «Выйшаў вечарам пакурыць», сцвярджае аўтар. Ён наогул любіць вобразы жывёл. Насамрэч яны — такія ж насельнікі Зямлі. Таму разам з імі можна прыйсці на «мелкаводдзе і проста глядзець на дно акіяна». Але бывае інакш, і тады чалавек апошняга адзінарога бачыць у выглядзе падзеленай на кавалачкі стравы. Жудасныя сны, хочацца іх адштурхнуць ці змяніць нешта сумна-безнадзейнае на нешта больш прывабна-чалавечае. І ўсё мяняецца: вы можаце гэта ж убачыць інакш — усё залежыць выключна ад вашага ўяўлення, ад вашых сноў ці жаданняў. У гэты момант сум змяняецца верай і іскрынкамі гумару, якога, дарэчы дастаткова ў кожным творы. А яшчэ тонкая ледзь улоўная надзея. Напрыклад, яна ёсць у ягоным творы



Даўнютка вы ў нас не былі.

«Яна не прыйшла. Ён не сышоў. Даўняя восень». Ці напоўніць вас чаканнем: «Астатняе — нешта будзе?» Будзе — вы ж у вялікім горадзе, дзе шмат розных магчымасцяў, падказвае аўтар. Усё навокал — і горад, і магчымасці, якія вы зноў-такі ствараеце сабе самі ў залежнасці ад таго, якімі вачыма глядзіце навокал. Гэта кранае і падкупляе: нездарма творы Сяргея Балянка карыстаюцца ўвагай і знаходзяцца ў музейных зборах розных краін і прыватных калекцыях у самых далёкіх частках свету. Дзіўна гэта, калі разглядаць назву твора як яго паўнавартасную частку (а гэта ж на вельмі тонкае разуменне).

Расшыфроўка назваў графічных твораў Сяргея Балянка — гэта яшчэ адзін мастацкі сродак. Цудоўны ён тым, што, разумеючы мастака праз назвы, атрымліваеш шанц лепш зразумець сябе, дастаць свае вобразы, ажывіць свае сны. Нават прачнуцца. І тут столькі з'яўляецца варыянтаў... Іх адчуваеш праз іншыя творы — жывапісныя, якія таксама прадстаўлены ў гэтай экспазіцыі. Яны эскпрэсіўныя, фарбаў — шчодра, ад душы. Як і эмоцый, на якія багатае рэальнае жыццё. Але, гледзячы на жывапіс, вы ўжо гуляеце па правілах, якія выставіў аўтар. Прымаеце яго пункт гледжання — паводле яго сюжэтаў і колераў. Але яшчэ не ведаеце, што калі пойдзеце адсюль, вас будуць праследаваць самотныя каты, пінгвіны ці цені. Прычым з колерамі на выбар. Іншасвет. Яго стварыла графіка, яна нібыта ўдакладненне яркай рэальнасці. Але такое дакладнае, што зразумела: усё рэальна. Нават тое, чаго пакуль не бачыш.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Творцы і творчасць

# Час збіраць кнігі

**Чытаць ці не чытаць — кожны вырашае сам. Але калісьці адной з найвялікшых перамог беларускай культуры была магчымасць зрабіць чытанне кніг больш даступным для людзей. Беларуская кніжнасць з эпохі Адраджэння, казала людзям: «Вы можаце, вы здольныя, вы магутныя». Магутнасць давалі словы — у іх была сіла думкі.**

**Кнігі, праз якія даюцца думкі, нараджаюцца ў беларускай культуры і зараз. Іх трэба толькі адшукаць, зразумець, што трэба чытаць. І чытаць — каб адчуваць сябе чалавекам разумным. Адна з кніг, якая скіроўвае да разваг і думак, «Час збіраць косці» нашага даўняга аўтара і шматгадовага вядучага конкурсу апавяданняў «Звязды» Віктара Казько была адзначана літаратурнай прэміяй імя Ежы Гедройца, але яшчэ перамагла ў галасаванні чытачоў, што не менш адметна. Таму што кніга не простая для ўспрымання. У яе ўвайшлі тры вельмі розныя аповесці: «Час збіраць косці», «Прахожы», «І нікога, хто ўбачыць мой страх», дзе аўтар, акрамя герояў, іх адносін з іншымі, стварае вобраз часу. Віктар Казько, які быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа, застаецца цяпер адным з жывых класікаў айчыннай літаратуры. А класіка — гэта ўзровень валодання словам, творчая планка, узор. Так, гэта літаратура, якую не будзеш «глытаць», у яе трэба ўчытвацца. З ёю трэба пражыць пэўны адрэзак часу, каб не страціць потым той самы час. Пра прызначэнне літаратуры сёння мы спыталі ў Віктара Апанасавіча:**

— Літаратура павінна гаварыць пра тое, як мы жывём і як будзем жыць. Вечны яе абавязак — адзначаць сённяшні дзень і думаць пра дзень будучы. Літаратура павінна гаварыць з чытачом пра час, пра жыццё, пра тое, што чалавек перажывае і адчувае. Таму яна павінна прыходзіць да людзей своечасова, а не так, як аповесці з гэтай маёй кнігі, якія праляжалі 20 гадоў і вось атрымалі шанц выйсці да чытача. Але тое, што я пішу зараз, зноў невядома калі і дзе можа быць выдадзена (ёсць амаль 60 аркушаў тэксту). У нас сітуацыя такая: пісьменнікаў шмат, усім хочацца бачыць свае кнігі выдадзенымі. І я разумею, што калі ў «Мастацкай літаратуры» выйшаў мой раман «Бунт незапатрабаванага праху», то сваю магчымасць я скарыстаў, трэба даць яе іншым. У нас у краіне каля 1000 пісьменнікаў агулам, неабходна даваць дарогу і маладым, і іншым калегам. Для нашых выдавецтваў працы — на шмат гадоў наперад. Толькі кнігі ствараюцца людзьмі ў свой час для людзей свайго часу. Вось што важна.

***— Ёсць меркаванне, што людзям у наш вельмі імклівы час складана жыць і паспяваць шмат. Таму ёсць спрашчэнне і ў такім мастацтве, як літаратура. Ці не страціцца з-за гэтага наогул зацікаўлены чытач?***

— Людзям ніколі не было лёгка жыць. А літаратура дапамагала: яна стымулявала думку. Калі ўзгадаць кнігі, якія да нас дайшлі з пачатку пісьменнасці — гэта што, лёгенькая літаратура, чытво? Заўсёды так было, што былі асобы, зацікаўленыя ў развіцці чалавека як істоты, якая мысліць, і тыя, хто наадварот імкнуўся, каб людзі пазбягалі думаць. Уся гісторыя — пра гэта. Таму што цёмнымі, непісьменнымі людзьмі было прасцей кіраваць. Але літаратура развівалася. Яна як люстэрка, у якое можна глядзецца і нешта разумець пра свет. Таму што літаратура дае думку. Я кажу пра сапраўдную літаратуру, а не пра гумку ў выглядзе маскультаўскага прадукту, які наадварот адвучае ад працэсу мыслення. Але менавіта гэты прадукт людзям актыўна прапаноўваюць, прасоўваюць яго праз тэлеканалы і гэта, напэўна, робіцца з пэўнымі мэтамі (у тым ліку нешта лепш прадаць і больш зарабіць). Але ў літаратуры насамрэч магутная ідэалагічная сіла, яна ўплывае на розумы...

***— Як упісацца ў свядомасць сучаснага беларускага чытача айчыннаму аўтару? За кошт чаго — тэм, ідэй, стылю ці, можа быць, праз нейкія асаблівыя захады папулярызацыі?***

— Ёсць стары анекдот: «Мы не плацім тры месяцы заробак, а яны ходзяць і ходзяць на працу». — «Тады зрабіце платны ўваход...» Дык вось у літаратуры даўно ўжо платны ўваход зроблены. Цяпер пісьменніку можна выдаваць кнігі за свой кошт. Творы з гэтай кніжкі, якая выйшла ў «Кнігазборы», праляжалі, перш чым удалося надрукаваць, а тое, што напісана сёння, яшчэ ляжыць у стале. Я прынцыпова супраць таго, каб аўтар плаціў за друкаваную кніжку. Але ўсё роўна пішу, таму што нічога іншага сёння рабіць не здольны. Я прывык так працаваць. Пісьменнік не можа не быць пісьменнікам. Асабліва тое пакаленне, якое сёння сыходзіць. Пісаць і выдаваць кнігі — гэта і ёсць галоўны момант, што патрэбен, каб прыходзіць да чытача. Гаварыць і думаць трэба своечасова, каб потым не было позна. Беларуская літаратура фактычна існуе ў стане «нашага незапатрабаванага праху». Ніхто не ведае, як наша слова адгукнецца. Гэта ніколі не было дадзена ведаць. Але літаратура як з'ява сёння патрабуе ўвагі грамадства. А грамадства — гэта ў тым ліку і дзяржава. Таму што без спонсарскай ці мецэнацкай дапамогі сёння не жыве ні заходняя, ні расійская літаратура. А наконт нашай літаратуры можна задаць пытанне, узгадваючы аднаго з польскіх класікаў Генрыка Сянкевіча: «Камо градзешы (Куды ідзеш)?» Гэтае пытанне можна адрасаваць і ўсім нам.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Прыгажосць без межаў

# Выбіраць — дык каралеву!

Індыйскія танцы пад «Касіў Ясь канюшыну» і кідкі цераз бядро — так у Мінску выбіралі самых грацыёзных і артыстычных студэнтак

**Сталіца прымала фінал XXIV Міжнароднага міжуніверсітэцкага конкурсу «Каралева Вясна», удзел у якім бралі дзяўчаты з шасці краін. «Звязда» дэлегіравала на мерапрыемства рэдакцыйных аматараў жаночай прыгажосці — маладых карэспандэнтаў, якія маглі не толькі на свае вочы ўбачыць самых грацыёзных прадстаўніц ВНУ блізкага і далёкага замежжа, але і, магчыма, наладзіць сваё асабістае жыццё... Дванаццаць разумніц і прыгажунь з Беларусі, Кітая, Латвіі, Расіі, Таджыкістана і Туркменістана — упускаць такі шанц нельга!**



Але неспадзяванка чакала яшчэ напачатку — месцы для прэсы знаходзяцца на балконе. Бачна добра, але занадта далёка ад саміх гераінь вечара. Хітрым і цішком абыходзім сцэну з іншага боку. У даўжэзным калідоры хутка знаходзім грымёрку. Але і тут мы не першыя — ужо чакаюць сваёй чаргі для інтэрв'ю іншыя журналісты. Суцяшае тое, што яны нам не канкурэнты, амаль усе — жанчыны.

Самі дзяўчаты ўжо паспелі пераапрануцца. Першы конкурс — выхад у нацыянальных строях, а таму за кулісамі быццам бы ажываюць старонкі савецкага геаграфічнага атласа «Свет і чалавек» (прызнайцеся, у вас дома ёсць такі): айчынныя вышыванкі, сібірскія мехавыя шапкі, усходнія даўжэзныя сукенкі і халаты.

Вядома, спачатку нас цягне на экзотыку. Знаёмімся з удзельніцай з Таджыкістана — Гульнорай АЗІЗАВАЙ. Яшчэ калі яна была маленькай, сям'і давялося эмігрыраваць у Расію з прычыны грамадзянскай вайны. У Смаленскім педагагічным каледжы дзяўчына вучылася на настаўніцу англійскай мовы, а пасля прыехала паступаць у Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт на перакладчыцу. Цяпер Гульнора, акрамя рускай мовы, валодае фарсі, англійскай, хіндзі і вывучае арабскую. Зазначаю для сябе, што з такой дзяўчынай-паліглотам можна адпраўляцца ў падарожжа хоць на край свету — і там яна будзе пачуваць сябе камфортна.

— Гульнора, ці праўда, што дзяўчаты з Усходу заўсёды вельмі сціплыя? — пытаюся з надзеяй у голасе.

— Я сказала б, што мы сціплыя толькі тады, калі гэта патрэбна, — усміхаецца дзяўчына.

— Чым будзеш браць публіку?

— Сваімі чароўнымі вачыма, — смяецца Гульнора, адразу ж дэманструючы... сціпласць. — А таксама індывідуальнасцю. Я думаю, што ў мяне ёсць усе якасці для таго, каб уразіць журы: харызма, пастаўленае маўленне, творчыя здольнасці. Асабліва спадзяюся на свой творчы нумар, бо таго, што зраблю я, не паказваў яшчэ ніхто ў гісторыі.

Па меркаванні дзяўчыны, вядучую ролю ў сям'і заўсёды павінен выконваць мужчына.

«Не наш варыянт», — сумна канстатуем мы і рухаемся на пошукі іншых удзельніц. Змяняем вектар — дзяўчаты з Латвіі цікавяць нас як носьбіты паўночнага менталітэту і спакою. З першай з латвійскіх удзельніц, Ілвіяй БЕНСОНЭ, даводзіцца практыкаваць майстэрства размовы жэстамі: канкурсантка амаль не ведае рускай мовы, але бярэ абаяльнасцю.

Знайсці агульную мову з іншымі ўдзельніцамі Ілвіі дапамагае зямлячка — Эліна ІВАНОВА. Дзяўчына вучыцца ў Латвійскім сельскагаспадарчым універсітэце і марыць працягнуць справу свайго бацькі, які мае ўласную гаспадарку непадалёк ад Ялгавы.





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Асабліва здзіўляе кола інтарэсаў Эліны: бальныя танцы, плаванне, музыка, гісторыя, класічны масаж... А падабаюцца дзяўчыне моцныя духам мужчыны, якія падтрымліваюць сваіх спадарожніц і ў радасці, і ў горы.

Авансам залічыўшы сябе хаця б да моцных духам, прыходзім да высновы, што пастаральная рамантыка нам даспадобы. Але час пашукаць каго-небудзь і з айчынных прыгажунь!

Святлана ГАРБАЧОВА з Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта дакладна не саступае сваёй латвійскай канкурэнтцы ў цікавасцях — акрамя вучобы (дзяўчына атрымлівае спецыяльнасць «Таваравед»), яна займаецца ў студэнцкім доме моды, харэаграфічным гуртку, удзельнічае ў розных кшталту творчых праектах.

— Насамрэч, я марыла паўдзельнічаць у гэтым конкурсе яшчэ з першага курса, — кажа Святлана. — Але сястра мяне тады адгаварыла, сказала, што яшчэ рана. А вось сёлета лёгка прыдумаўся творчы нумар і я нарэшце прыехала. Мой танец адсылае да мультфільма Ціма Бёртана «Труп нявесты», толькі калі ў арыгінале дзяўчына забрала хлопца з сабой на той свет, у нас усё будзе больш жыццесцвярджальна. Думаю, калі атрымаецца годна выступіць, то мы зможам і за перамогу пазмагацца.

На жаль, працягнуць прыватныя размовы і лёгкі флірт перашкодзіў сам конкурс. Арганізатары зрабілі ўдзельніцам апошнія настаўленні і папярэдзілі аб хуткім выхадзе на сцэну. Не наталіўшы прагу прыгажосці, мы вымушаны былі вярнуцца на свае месцы.

На першым з этапаў — выхадзе ў народных строях — асабліва вылучыліся расіянка Анастасія КЛІМЕНКА з Новасібірскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі і кіравання, якая праспявала «Купалінку», і наша новая знаёмая Святлана Гарбачова, што выступіла па-беларуску (несумненна, пад уплывам «звяздоўцаў»).

А як жа інтэлектуальныя здольнасці? Іх канкурсанткі маглі прадэманстраваць у другім конкурсе, падчас якога кожнай з удзельніц трэба было ўвайсці ў вобраз палітыка і выступіць перад публікай. Кітаянка Лю ЧАН з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, напрыклад, распавяла, што яе кумірам з'яўляецца актрыса Одры Хепберн з прычыны яе ўдзелу ў дабрачынных акцыях. «Шчасце іншых важнейшае за прыгажосць», — сказала кітайская канкурсантка. Тэмай выступлення Эліны Івановай стала сяброўства паміж народамі, сваім кумірам дзяўчына назвала былога прэзідэнта Латвіі Вайру Віке-Фрэйберга. А Гульнора Азізава выступіла супраць любых войнаў на зямлі.

Трэці выхад — дэфіле, пасля якога надышоў час, напэўна, самага важнага конкурсу — творчага. Цікава, што большасць дзяўчат выбрала для выступу майстэрства танца. Так, напрыклад, расіянка Анастасія БАРАННІК з Саратаўскага сацыяльна-эканамічнага інстытута імя Пляханава выканала адразу некалькі танцаў у розных стылях у нумары «Сон пра парашутыстку» (дзяўчына сама займаецца парашутным спортам). Гульнора Азізава, якая абяцала паказаць нам унікальны нумар, выканала індыйскі танец пад музыку з песні «Касіў Ясь канюшыну», сарваўшы апладысменты публікі. А наша суайчынніца Анастасія ПЕСЦЕРАВА з Акадэміі МУС аб'яднала танец з... працэдурай затрымання злачынцы і рукапашным боем! З такой знаёмай хуліганаў у падваротнях дакладна можна не баяцца. Таленты дзяўчат не абмяжоўваліся харэаграфіяй. Так, Лю Чан уразіла слухачоў выкананнем музыкі на кітайскім народным інструменце пад назвай піпа, які нагадвае лютню, а Эліна Іванова праспявала латышскую песню «Цёмная ноч, зялёная трава».

Пасля яшчэ аднаго дэфіле пачаўся доўгі працэс вызначэння пераможцы. Трэба заўважыць, што інтуіцыя нас не падманула — менавіта Святлана Гарбачова, адзіная канкурсантка з Беларусі, з якой мы наважыліся пазнаёміцца, заваявала карону «Каралевы Вясны». Тытул віцэ-міс дастаўся аматарцы экстрыму Анастасіі Баранік. А пераможцай галасавання ў інтэрнэце стала будучы міліцыянер Анастасія Песцерава.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■ Песню бярыце з сабою

# ВАЛЬС РОСТАНІ

**Вальсавая мелодыя вытанчана, у пластычна-зменлівым рытме перадае імклівасць душэўных перажыванняў, іх лірычна-ўзрушаную высакароднасць. Покліч душы арганічна ўвасабляецца ў руках. Вальс — парны танец. Падчас яго энергія адной асобы пачуццёва кранае другую. І ўзнікае дзівосны палёт душаў, ахопленых чароўным памкненнем — любіць, дзейнічаць, ствараць.**
**Гэтая магічная сіла духоўна-прасветлага саюза выразна выяўлена ў песні «Вальс ростані» Івана Карэнды і Васіля Раінчыка. Аўтары пранікліва адлюстравалі ўзнёсла-напружаную пачуццёвую плынь, якая ахінае душы выпускнікоў на жыццёвым раздарожжы. Такое шчымлівае адчуванне часу і асабістага далучэння да яго разгортваецца на пачатку лета, калі і прастора, і людзі, асабліва моладзь, патанаюць у калярова-духмяным мроіве.**




**Верш Івана КАРЭНДЫ**
**Музыка Васіля РАІНЧЫКА**

*Чарадою буслінаю*
*На крылах маладых*
*Пранесліся шчаслівыя*
*Студэнцкія гады.*
*Мы ведаем: не вернецца*
*Чародка тых буслоў,*
*Ды вернецца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*
*Нам верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*

*Бывай, жыццё юнацкае!*
*Сяброўскі гурт, бывай!*
*Вячоркі інтэрнацкія,*
*Мой друг, не забывай.*
*Мы ведаем: не вернецца*
*Пара пяшчотных сноў,*
*Ды верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*
*Нам верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*

*Хоць сталі мы дарослымі, —*
*Слязу не выцірай.*
*Апошні баль — баль ростані.*
*Іграй, аркестр, іграй!*
*Мы ведаем: не вернецца*
*Цяпло растайных слоў.*
*Ды верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*
*Нам верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## Курынае філе ў бульбе

Яно атрымліваецца вельмі сакавітым, мяккім і далікатным. Таму што бульбяная абалонка не дае выцякаць смачным мясным сокам.

***Спатрэбіцца:*** *2 курыныя філе, 5 сярэдніх бульбін, 4 ст. лыжкі смятаны, 2 яйкі, 3 ст. лыжкі мукі, 1 цыбуліна, зубок часнаку, соль, перац, спецыі, алей.*



Кожнае філе разразаем на дзве паловы ўздоўж, каб атрымаліся чатыры плоскія кавалачкі. Злёгку адбіваем солім, пасыпаем спецыямі.

Бульбу надзіраем на буйной тарцы. Часнок і цыбулю здрабняем. У бульбу дабаўляем яйка, муку, смятану, цыбулю і часнок, соль і перац. Добра змешваем. Кладзём у бульбяную масу кавалачак філе, акунаем яго глыбей, потым пад яго падкладаем лапатачку, каб бульбяная маса не сцякла назад у талерку. І пераносім кавалак на патэльню. Абсмажваем па дзве хвіліны з кожнага боку. Бляху засцілаем паперай для выпечкі. Выкладваем на яе курыныя «шніцалі». Змазваем смятанай і адпраўляем у разагрэтую да 180 градусаў духоўку на дзесяць хвілін.

## Капусная лазання, або галубцы па-італьянску:

***Спатрэбіцца:*** *капуста белакачанная — 8 лістоў; фарш мясны — 400 г; рыс — 100 г; сыр цвёрды — 100 г; цыбуля рэпчатая — 2 шт. буйныя; морква — 2 шт. буйныя; таматная паста — 2 ст. лыжкі; алей — 2 ст. лыжкі; малако — 300 мл; масла — 1 ст. лыжка; мука — 1 ст. л.; арэх мускатны — дробка; соль, перац чорны, цукар — на смак; смятана — для падачы.*



Капусныя лісты пакласці ў кіпячую ваду на 5 хвілін. Выняць, астудзіць. Сыр надзерці на буйной тарцы. Фарш змяшаць з рысам, пасаліць, паперчыць. У патэльні разагрэць алей. Цыбулю нарэзаць кубікамі, моркву надзерці на тарцы. Абсмажыць цыбулю да празрыстасці, потым дабавіць моркву. Трохі абсмажыць і дабавіць таматную пасту. Абсмажыць хвілінку і давесці да патрэбнага смаку соллю, перцам і цукрам.

Для соусу бешамель масла растапіць у патэльні, дабавіць муку, перамяшаць. Не здымаючы з агню, невялікімі порцыямі трэба ўліць малако. Памешваючы, давесці да кіпення і гатаваць 3-5 хвілін, пакуль соус згусне. Пасаліць, паперчыць і запраўіць мускатным арэхам. На дно формы для запякання выкласці трохі соусу, зверху капуснае лісце. Гэта могуць быць не цэлыя лісты, а кавалачкі. Потым выкласці слой фаршу. Зверху — слой гароднiны і зноў соус. Лісты капусты. Пасыпаць дзёртым сырам. Слаі паўтарыць.

Духоўку разагрэць да 170 °С. Гатаваць лазанню прыкладна 40-50 хвілін. Затым форму выняць, даць пастаяць хвілін 10 і можна падаваць.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Другое жыццё любімых рэчаў

**Як быць, калі любімае адзенне страціла свой глянец і навізну, а расстацца з ім рука не падымаецца? Варта скарыстацца прыёмамі, якія могуць удыхнуць у старыя рэчы новае жыццё.**

**ПЕРАРОБЛІВАЕМ ЗНОШАНЫЯ РУКАВЫ**

Дэфармаваныя часам рукавы прасцей за ўсё з дапамогай нажніц пакараціць да зручнага і моднага памеру 3/4 або пераўтварыць іх у тып «ліхтарык», прасунуўшы гумкі. Цікавым рашэннем будзе акантоўка краю рукава яркай тасьмой або стужкай.

**ЗМЯНЯЕМ ГАРЛАВІНУ КОФТЫ**



Не бойцеся эксперыментаваць з выразам кофты, пуловера, вадалазкі, робячы яго больш глыбокім. Новая гарлавіна і яе афармленне карункамі, тасьмой, акантоўкай, абвязкай кручком нададуць навізну ўсёй рэчы.

**АБНАЎЛЯЕМ НІЗ**

Любыя штаны з абтрапаным нізам можна лёгка трансфармаваць пад ваш густ. І вось ужо гардэроб папаўняецца або новымі шортамі, капры або брыджамі.



**РОБІМ ЗДЫМНЫ КАЎНЕРЫК**

Стары каўнер кашулі без цяжкасці можна пераўтварыць у модны аксесуар, упрыгожыўшы яго атласнай або аксамітнай тканінай, «самацветамі» са штучных камянёў, стразамі, карункамі, бісерам. Увогуле ўсім, на што хопіць фантазіі.

**УПРЫГОЖВАЕМ**



Любімую патрапаную жыццём вопратку можна ўпрыгожыць паеткамі або россыпам кветак з тканіны. Апошнія можна прымацаваць пры дапамозе адмысловага клею.



**ВЫШЫВАЕМ**

З гэтым відам упрыгажэння справіцца нават пачатковец, бо выкарыстоўваць можна разнастайныя тэхнікі. Дабаўце да гэтага разнастайную фактуру нітак — і вы ўладальніца сапраўднай аўтарскай рэчы. Для зручнасці працы падрыхтуйце шаблоны ўзораў і перанясіце іх на адзенне адмысловымі фарбамі для тканіны, якія раствараюцца ў вадзе.

Даты | Падзеі | Людзі

**6 ЧЭРВЕНЯ**

**1841** год — нарадзілася (маёнтак Мількаўшчына, цяпер Гродзенскі раён) Эліза Ажэшка (Паўлоўская), польская пісьменніца. Падчас паўстання 1863—1864 гадоў была сувязной партызанскага атрада Р. Траўгута, які дзейнічаў на беларускім Палессі. Аўтар апавяданняў «Рэха», «Тадэвуш», аповесцей «Нізіны», «Дзюрдзі», рамана «Над Нёманам». Творы пісьменніцы «У зімовы вечар» і «Хам» ставіліся Першай беларускай трупай Ігната Буйніцкага і Першым таварыствам беларускай драмы і камедыі. Памерла ў 1910 годзе. У Гродне захаваўся дом, дзе жыла Эліза Ажэшка, у ім створаны музей. У горадзе ўстаноўлены помнік пісьменніцы, яе імем названа адна з галоўных вуліц.

**1874** год — нарадзіўся (г. Мінск) Канстанцін Сцяпанавіч Ерамееў, партыйны і ваенны дзеяч, журналіст. Працаваў у рэдакцыі бальшавіцкай газеты «Звезда». Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі быў адным з кіраўнікоў штурму Зімовага палаца ў сектары Траецкі мост — Сіні мост на Мойцы. Удзельнічаў у падаўленні бунту Керанскага-Краснова, у разгроме мецяжу «левых» эсэраў у Маскве. У 1919—1922 гадах з'яўляўся ўпаўнаважаным УЦВК і ЦК РКП (б) па мабілізацыі ў Чырвоную Армію. Адзін з арганізатараў Дзяржвыда СССР, рэдактар «Рабочей газеты», першы рэдактар часопіса «Крокодил» (1922—1928). З 1926 года — прадстаўнік гандлёвага флоту ў Францыі. У 1929—1931 гадах — рэдактар часопіса «Красная нива». Памёр у 1931 годзе.



**1950** год — 65 гадоў з дня нараджэння (вёска Клёны Дубровенскага раёна) Аляксея Ануфрыевіча Дударава, беларускага пісьменніка, драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1991). Па яго сцэнарыях пастаўлены кароткаметражныя і мастацкія фільмы «Суседзі», «Белыя росы». Аўтар п'ес «Вечар», «Радавыя», «Чорная панна Нясвіжа», «У прыцемках» і іншых. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1982, 1984), Дзяржаўнай прэміі СССР (1985). З 1992 года — старшыня Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі.

Было сказана

**Люба ТАРАСЮК, паэтэса:**
*Уся зямля — адзін стары курган,*
*Куды сышліся нашых продкаў продкі.*



Юных звяздовак — прыгажунь і спартсменак, шчырых працаўніц і разумніц — **Надзею ДРЫЛУ і Наталлю ЛУБНЕЎСКУЮ,** а таксама іх абраннікаў — **спадароў Уладзіміра і Аляксандра** — шчыра віншуем з рэгістрацыяй шлюбу! Разумення вам, каханенькія-родненькія, ладу і згоды, грошай... А галоўнае — да скону захаваць пачуццё, якое звяло ў цудоўны саюз з прыгожаю назвай сям'я!



**Звяздоўцы.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.41 | 21.36 | 16.55 |
| Віцебск | 4.22 | 21.34 | 17.12 |
| Магілёў | 4.31 | 21.26 | 16.55 |
| Гомель | 4.37 | 21.14 | 16.37 |
| Гродна | 4.58 | 21.50 | 16.52 |
| Брэст | 5.07 | 21.41 | 16.34 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 9 чэрвеня.***
***Месяц у сузор'і Вадалея.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Івана, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
***К.*** *Марыі, Паўліны, Сымона.*



Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

# ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +27..+29°С | КІЕЎ +24..+26°С | РЫГА +19..+21°С |
| ВІЛЬНЮС +24..+26°С | МАСКВА +26..+28°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +17..+19°С |

УСМІХНЕМСЯ

Вопытны кіраўнік можа па гуку клавіятуры вызначыць, у што менавіта гуляе яго падначалены.

**Брутальны мужчына не падае — ён атакуе падлогу!**

— Бэла Майсееўна, вы такі не хочаце схадзіць са мной у музей?
— Якаў Саламонавіч, хіба ж вы слова «рэстаран» не вымаўляеце?



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.117. Індэкс 63850. Зак. № 2140.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 чэрвеня 2015 года.